Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 СНЕЖНЯ 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 230
(26343)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду і Нацбанку задзейнічаць усе рычагі для продажу прадукцыі і захавання рынкаў збыту

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду і Нацыянальнаму банку задзейнічаць любыя рычагі для таго, каб прадаць прадукцыю і не страціць рынкі збыту. Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім і старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Пятром Пракаповічам.

На сустрэчы была абмеркавана сітуацыя, якая складваецца ў свеце ў сувязі з фінансавым крызісам, а таксама меры, якія павінны прыняць урад і Нацыянальны банк для мінімізацыі ўплыву крызісных з'яў у Беларусі.

«Я хацеў бы папрасіць вас, каб ва ўрадзе яшчэ раз абмеркавалі сітуацыю, якая складваецца ў свеце ў сувязі з фінансавым крызісам. Мы сёння рады таму, што мы не так уцягнуты ў гэты фінансавы крызіс, які ахапіў многія дзяржавы. Гэта сапраўды наш здабытак. Але тым не менш мы вельмі добра разумеем, і людзі адчуваюць, што быць убаку ад крызісу не атрымаецца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адзінае, чым сёння гэты крызіс зацягвае Беларусь, гэта спад плацежаздольнага попыту ў свеце. Паколькі Беларусь — краіна з экспартаарыентаванай эканомікай, то і попыт на беларускую прадукцыю ў свеце ў цэлым таксама падае.

«Аднак абсалютна недапушчальна працаваць на склад. Калі мы пазбавімся абаротных сродкаў, то прадпрыемствы апынуцца без грошай, а прадукцыя будзе нерэалізаваная, ляжаць на складах. Я хацеў бы, каб гэта патрабаванне было даведзена да ўсіх кіраўнікоў», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што ў канцы гэтага і пачатку будучага гадоў ён плануе засяродзіць сваю ўвагу на рабоце прадпрыемстваў Беларусі, перш за ўсё па збыце прадукцыі. «Я буду глядзець, пачынаючы ад складоў, якая вытворчасць, чым займаецца і, галоўнае, як прадае прадукцыю, якую вырабляе. І спасылкі на тое, што сёння цяжка, немагчыма прадаць прадукцыю, не прымаюцца. Я яшчэ раз хачу паўтарыць: крызіс — гэта не для нас. Мы павінны выйсці з гэтага крызісу моцнымі, мы павінны працаваць і не спасылацца на тое, што крызіс нас падкасіў. Урад і ўсе структуры ўлады павінны перайсці на рэжым Міністэрства гандлю. Увесь урад павінен стаць, вобразна кажучы, Міністэрствам гандлю», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Кіраўнікоў прадпрыемстваў трэба прымусіць працаваць так, нібыта няма ніякіх крызісаў, і прадаваць сваю прадукцыю», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што адбылася яго сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Індыі ў Беларусі Раджэндрам Кумарам Цягі. «Яны сёння гатовы стварацца СП з нашым шынным камбінатам, БелАЗам. Вось, калі ласка, наш рынак. Вялікі рынак. І гэта трэба выкарыстаць», — прывёў прыклад Прэзідэнт.

Асаблівую ўвагу ён удзяліў сацыяльнаму аспекту пераадолення эканамічных праблем. «Самае галоўнае, чаго б гэта ні каштавала, прадпрыемствы трэба захаваць. І ні ў якім выпадку не дапусціць звальнення людзей у сувязі з гэтым так званым сусветным крызісам. Ні ў якім выпадку, ніводны чалавек не павінен быць выкінуты на вуліцу, як гэта адбываецца ўжо ў нашых суседзяў. Мы не можам выкідаць людзей на вуліцу. Людзі павінны мець работу, рабочыя месцы», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Любымі шляхамі трэба захоўваць прадпрыемствы. І калі недзе будуць нейкія праблемы, мы людзей будзем падтрымліваць. Дзякуй богу, што цяпер няма ніякай такой надзвычайнай сітуацыі. Але, плануючы, нам трэба зыходзіць з горшага варыянта», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама даручыў ураду своечасова і аб'ектыўна інфармаваць работнікаў, калі на якім-небудзь прадпрыемстве ўзнікнуць цяжкасці. «Мы чым можам, тым дапаможам. Крызіс завершыцца. Крызіс прыходзіць і адыходзіць. Вось калі мы спецыялістаў страцім, як гэта было ў пачатку і сярэдзіне 90-х гадоў, потым іх з нейкіх рынкаў будзе цяжка вярнуць у вытворчасць», — адзначыў Прэзідэнт.

«Усё гэта даводзіць да мяне, узгадняць, даваць нармальны, сумленны, аб'ектыўны аналіз сітуацыі і сігналы ў грамадства. Людзі павінны ведаць усё, што адбываецца», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

«Мы сказалі, што будзем гарантаваць уклады насельніцтва, сказалі, што мы не будзем патрабаваць дэкларацыі, і сёння да мяне прыйшлі бізнэсмены, якія хацелі б да $100 млн перавесці з іншых краін у нашы банкі. Значыць, давер да банкаўскай сістэмы ёсць. Мы іх толькі вітаем. Замежныя прадпрыемствы, фірмы да нас хочуць перавесці грошы. Не толькі прыватныя асобы, але і юрыдычныя. Гэта дарагога варта. Гэта трэба падтрымліваць. Але мы павінны быць з усімі сумленныя. І са сваімі людзьмі, і з замежнымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі», — адзначыў Прэзідэнт, звяртаючыся да прэм'ер-міністра.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў: «Мы інвестыцыямі практычна не займаліся. Чыноўнікі сталі нахабныя да крайнасці. Дык пастаўце ім канкрэтныя задачы. І — пытанні па кадрах. Усе, хто не здольны працаваць у крытычным рэжыме, павінны быць заменены. У нас няшмат такіх міністраў, але калі мы бачым, што дзесьці яны не выцягваюць, дзесьці ў іх жадання няма, трэба даць магчымасць працаваць іншым людзям. Я гэта гавару не таму, што надзвычайшчына нейкая ў краіне. Цяпер будзе разумным на ўсякі выпадак рыхтавацца да горшага сцэнарыя, як мы заўсёды робім».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пры вырашэнні актуальных пытанняў у эканоміцы неабходна выкарыстоўваць толькі эканамічныя метады, падтрымліваць прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнэсу. «А эканамічную сітуацыю, што склалася ў свеце, трэба пастарацца выкарыстаць у сваіх мэтах, з выгадай для краіны», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НОВІКІ І ІХ ДЗЕЦІ

Журналісцкае расследаванне

Як ва ўсялякай прафесіі, у прафесійнага бацькоўства ёсць свае падводныя камяні. І можна было б лічыць гэта праблемай асобна ўзятай катэгорыі людзей, калі б яна не датычылася ўсіх нас

Алена Аляксандраўна пісьмо ў рэдакцыю пісала ў тры заходы. Спярша яна хацела спытаць: чаму дзеці — сіроты біялагічныя і сацыяльныя — знаходзяцца не ў аднолькавых умовах? І тыя, і гэтыя засталіся без апекі бацькоў. Але першыя атрымліваюць грашовую дапамогу ад дзяржавы і пенсію па страце карміцеляў, а другія — толькі дапамогу. «Дзеці не вінаватыя, што бацькі п'юць, а не памерлі», — мяркуе яна. Але галоўнае, што прымусіла маці 13 дзяцей узяцца за пяро, былі словы аднаго з кіраўнікоў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, надрукаваныя ў «Звяздзе» ў жніўні — аб тым, што аб'ём матэрыяльнай падтрымкі дзіцячым дамам сямейнага тыпу большы, чым прыёмнай сям'і: «…У прыватнасці, гэта датычыцца забеспячэння неабходным абсталяваннем, мэбляй, мяккім інвентаром, выдзялення дадатковых сродкаў на гаспадарчае абслугоўванне будынкаў, аплату за водазабеспячэнне, каналізацыю, вываз смецця і іншыя выдаткі, звязаныя з эксплуатацыяй будынкаў, набыццём медыкаментаў». У Алены Новік было не так. Яна расказала кароткую гісторыю сваёй сям'і.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Дзед Мароз абяцаў, няхай ён газ і падводзіць!»

«Мы былі прыёмнымі бацькамі з 2002 года. У мяне стаўка — 4 дзетак, і ў мужа стаўка — 4 дзетак. Плюс трое сваіх родных. Усяго — 11.

У 2007 годзе з нашай прыёмнай сям'і зрабілі дзіцячы дом сямейнага тыпу і палову стаўкі забралі. На сям'ю — не больш за 1,5 стаўкі…» — піша яна. Тут трэба патлумачыць.

У нашым заканадаўстве прапісана, што «агульная колькасць дзяцей у прыёмнай сям'і, уключаючы родных і ўсыноўленых, як правіла, не павінна перавышаць 8 чалавек» (да 2006 года — 4). Такім чынам, сям'я Новікаў не ўпісвалася ў агульнае правіла. Можа для такіх і пакінуты ў законе выраз «як правіла», бо жыццё можа быць куды больш складаным і разнастайным, чым прадугледжвае інструкцыя. Тое, што Новікі — сям'я незвычайная, заўважыў і кінадакументаліст Уладзімір Бокун, які зняў у 2005 годзе пра іх фільм у рамках тэлевізійнага праекта «Лёс чалавека». «Гэта ўнікальныя людзі, — падзяліўся рэжысёр з журналістам «Звязды» (12.11.2005). — Не маюць ніякай спецыяльнай адукацыі, толькі з дапамогай любові, ласкі і ўвагі, ім удаецца неверагоднае: яны «выцягваюць» дзяцей з цяжкіх дыягназаў». Не дзіва, што органы апекі Смаргонскага раёна ішлі на парушэнне «літары» закона ў інтэрэсах дзяцей, даручаючы апошніх Новікам звыш прапісанага ліміту.

Разам з тым Новікі даўно ўжо хацелі атрымаць статус дзіцячага дома сямейнага тыпу. Усё для гэтага ў іх было: колькасць дзяцей, вопыт і нават — жыллё. Яны з дапамогай ільготнага крэдыту (як шматдзетная сям'я) купілі вялікі — 270 кв.м — дом у вёсцы пад Смаргонню. «Калі б не дзеці, няўжо мы купілі б такі дом, — кажа Мікалай Новік. — Мы ж не мільянеры! Для дзяцей купілі!» Але выканкам не спяшаўся пераводзіць Новікаў са статусу прыёмнай сям'і ў статус дзіцячага дома. Дом быў без унутранай апрацоўкі і Новікі самі сцялілі падлогу, тынкавалі сцены, клеілі шпалеры, ставілі дзверы, батарэі, падводзілі газ і купілялі мэблю. Ім было і застаецца нялёгка, пра гэта сведчаць тэмпы рамонту. Спачатку яны зрабілі адзін пакой і кухню і пераехалі, за тры гады давялі да ладу другі паверх — пяць дзіцячых пакояў. Яшчэ пару гадоў, кажуць яны, і рамонт будзе завершаны. Праўда, трэба будзе пачынаць на другім крузе, але гэта ўжо іншае.

На пачатку 2007 года органы апекі атрымалі распараджэнне прывесці ў адпаведнасць з заканадаўствам сітуацыю з прыёмнымі сем'ямі. Тады Новікаў і яшчэ адну прыёмную сям'ю на Смаргоншчыне, іх суседзяў Рэшкевічаў, у якіх таксама «ліміт» па колькасці дзяцей быў перабраны, нарэшце, перавялі ў статус дзіцячага дома сямейнага тыпу. Аднак зроблена гэта было ціха — адкрыцця дзіцячага дома з прыездам мэра, падарункамі і прэсай не было. Практычна нічога не змянілася і ў жыцці гэтых двух першых у Смаргонскім раёне сямейных дзіцячых дамоў.

«…Ад мясцовай улады не атрымалі ні цвіка, ні рубля, — піша Алена Аляксандраўна. *— Нам прапаноўвалі дапамогу ад аддзела сацыяльнага забеспячэння («плечыкі» — адзенне вешаць) — мы адмовіліся. Будзе што павесіць, зной-дзем і на што павесіць. У дзяцей падручнікі, праезд, пуцёўка ў аздараўленчы лагер у чацвёртую змену бясплатныя. За камунальныя паслугі плацім самі, а потым нам робяць перараслік і на прыёмных дзяцей вяртаюць грошы. Усё — аднолькава як і ў прыёмных сем'ях. А дзе забеспячэнне неабходным абсталяваннем, мэбляй, мяккім інвентаром, сродкі на гаспадарчае абслугоўванне будынка і іншыя выдаткі, набыццём медыкаментаў?*

Жывём у вёсцы, трымаем карову. Сена сельсавет не дае, бо не здаём малако дзяржаве. А што я магу здаць з адной каровы пры такой сям'і? Але, дзякуй Богу, накасілі на кароўку па лясах, па равах…»

Але не гэта больш за ўсё хвалявала Алену Новік. Напрыканцы пісьма яна піша пра тое, што сапраўды трывожыць, і просіць аб дапамозе:

«…Мы нават ні разу не былі ў адпачынку і не атрымлівалі кампенсацыі за нявыкарыстаны водпуск. Нам сказалі, што і не атрымаем, бо ў раёне няма лішніх сродкаў. Пра водпуск хвалюемся не адны мы: у раёне 38 прыёмных сем'яў і амаль палова з іх не былі ў водпуску і не атрымалі кампенсацыю. З 2009 года нявыплачаныя за нявыкарыстаныя водпускі грошы прападуць. Дарагая «Звязда», дапамажыце атрымаць кампенсацыю за водпускі: мы не настолькі багатыя, каб губляць грошы. А з астатнімі праблемамі мы справімся самі, абы было здароўе…».

Пісьмо гэта Алена Аляксандраўна кінула ў паштовую скрыню не адразу. Тыдзень яна думала, адпраўляць або не. Тым часам у рэдакцыю прыйшло падобнае пісьмо ад іншага дзіцячага дома сямейнага тыпу, з Ляхавіцкага раёна. Напісала яго не маці, а дзіця.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Прэзідэнт Беларусі аб'явіў вымову Р. Васілевічу, П. Міклашэвічу, В. Шэйману і М. Дамашкевічу

Прэзідэнт Беларусі 4 снежня падпісаў указ аб прыцягненні да адказнасці некаторых службовых асобаў.

За сур'ёзныя хібы ў рабоце з кадрамі ў органах пракуратуры, непрыняцце належных мераў па аднаўленні законнасці, парушанай пры прадастаўленні Мінскім райвыканкамам зямельных участкаў у раёне дачнага пасёлка «Крынічны» Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама па забеспячэнні нагляду за выкананнем патрабаванняў жыллёвага заканадаўства пры разглядзе грамадзянскіх спраў з удзелам былога пракурора Мінскай вобласці Снегіра М.В. аб'яўлена вымова генеральнаму пракурору Рыгору Васілевічу і былому генеральнаму пракурору Пятру Міклашэвічу.

За значныя хібы ў рабоце па падборы і расстаноўцы кіруючых кадраў у органах пракуратуры аб'яўлена вымова былому Дзяржаўнаму сакратару Савета Бяспекі Беларусі Віктару Шэйману.

Вымова аб'яўлена і былому старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалаю Дамашкевічу за непрыняцце належных мераў па забеспячэнні кантролю за выкананнем заканадаўства пры прадастаўленні Мінскім райвыканкамам зямельных участкаў у раёне дачнага пасёлка «Крынічны» Міністэрства ўнутраных спраў.

Першым намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам крымінальнай міліцыі назначаны Анатоль Куляшоў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў генерал-маёра міліцыі Анатоля Куляшова першым намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам крымінальнай міліцыі, вызваліўшы яго ад пасады намесніка міністра ўнутраных спраў — начальніка міліцыі грамадскай бяспекі. Указ аб гэтым кіраўнік дзяржавы падпісаў 4 снежня.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аб'ём укладаў у банках павялічваецца

Сёння беларускія банкі не скарачаюць у масавым парадку выдачу спажывецкіх крэдытаў, падкрэсліў намеснік старшыні Нацыянальнага банка Беларусі Мікалай Лузгін на прэс-канферэнцыі, каментуючы сітуацыю ў краіне па крэдытаванні насельніцтва. Хоць ён не выключае і таго, што некаторыя банкі сапраўды скарацілі аб'ём выдачы доўгіх спажывецкіх крэдытаў.

Разам з тым, паводле слоў банкіра, усе банкі выконваюць жыллёвае крэдытаванне, будзе выкананы і план па льготным крэдытаванні будаўніцтва жылля. У сваю чаргу старшыня Асацыяцыі беларускіх банкаў Фелікс Чарняўскі заўважыў, што шэраг айчынных банкаў атрымліваюць падмацаванне ліквіднасці з-за мяжы. А ў сувязі з тым, што цяпер адчуваюцца складанасці з ліквіднасцю на сусветных рынках, натуральна, умовы для спажывецкага крэдытавання ў рэспубліцы пагоршыліся. У Беларусі, зазначыў Мікалай Лузгін, няма фінансавага крызісу ў яго класічным разуменні. Аднак ускосны ўплыў усё ж такі адчуваецца: у прыватнасці, некаторыя заходнія банкі сталі абмяжоўваць для айчынных свае крэдытныя лініі, павялічваць працэнтныя стаўкі па крэдытах.

Гаворачы аб той няпростай сітуацыі, якая склалася ў свеце, Мікалай Лузгін паведаміў, што Нацбанк сёння надае асаблівую ўвагу ўстойлівасці банкаўскай сістэмы. «Калі абанкруціцца сярэдняе прадпрыемства — гэта дрэнна, але магчыма пражыць, — заўважыў ён. — Калі ж пачнуць падаць банкі, то гэта будзе найгорш для эканомікі». Таму тут сітуацыя трымаецца пад кантролем. Паводле яго слоў, цяпер прымаюцца як звычайныя, так і нестандартныя меры па падтрымцы банкаўскай сістэмы, узмацняецца нагляд, кантроль на валютным рынку. У агляднай перспектыве, упэўнены банкір, беларускім банкам нічога не пагражае.

Мікалай Лузгін праінфармаваў і аб тым, што падрыхтаваны праект указа, які дапрацоўваецца, аб павелічэнні статутных фондаў сістэмаўтваральных банкаў за кошт дзяржаўных укладанняў. Ён запэўніў, што гэты крок не з'яўляецца беспрэцэдэнтным, таму што статутныя фонды дзяржаўных банкаў папаўняюцца пастаянна. Аднак сітуацыя спецыфічная, ёсць праблемы з ліквіднасцю банкаў. Каб падтрымаць банкаўскую сістэму краіны ў цэлым, паменшыць попыт на рэсурсы на міжбанкаўскім рынку, і будуць прыняты адпаведныя меры. Адказваючы на пытанне аб цяперашняй сітуацыі са зберажэннямі насельніцтва ў беларускіх банках, Мікалай Лузгін зазначыў, што аб'ём дэпазітаў насельніцтва павялічваецца. «Тэмпы росту невялікія, але гэты працэс будзе працягвацца і далей», — спадзяецца банкір. Ён дадаў, што ў цэлым зарплаты ў рэспубліцы працягваюць расці, а таму аб'ём зберажэнняў таксама будзе павялічвацца. Адносна зарплаты, рост якой будзе працягваецца, прадстаўніка Нацбанка падтрымаў і намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур, які, у прыватнасці, падкрэсліў: «Павышэнне зарплаты з 1 снежня ёсць, але не ў такіх памерах, як гэтага хацелася б раней». Як запэўніў Фелікс Чарняўскі, адтоку сродкаў насельніцтва з банкаўскіх рахункаў сёння не назіраецца. Паводле яго слоў, давер людзей да банкаў у Беларусі не ўпаў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Беларуская эканоміка мае высокі запас трываласці

ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу, падкрэсліў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур. Паводле яго слоў, Беларусь прадоўжыць перагаворы з Міжнародным валютным фондам аб выдзяленні ёй крэдыту ў памеры $2 млрд. Ён канстатаваў, што ў Беларусі паніжана тарыфная стаўка першага разраду. «У перагаворах з МВФ па пытанні прадастаўлення крэдыту будзе разглядацца не толькі пытанне паніжэння заработнай платы, але цэлы комплекс мераў. Я думаю, зніжэнне ўзроўню зарплаты ў Беларусі не з'яўляецца ключавым момантам у гэтых перагаворах», — сказаў намеснік міністра эканомікі. Андрэй Тур падкрэсліў, што беларуская эканоміка адкрытая і ў многім залежыць ад развіцця сітуацыі на знешніх рынках. Таму ў далейшым могуць узнікнуць некаторыя праблемы «з пункту гледжання развіцця». «Магчыма, больш складаная сітуацыя будзе ў першым квартале наступнага года, аднак як толькі пачнецца ўздым у свеце, будзе значна лягчэй і ў Беларусі, — сказаў ён. — Цяпер нам вельмі важна, каб эканоміка развівалася, можа, не такімі высокімі тэмпамі, як у папярэднія гады, але яна павінна быць без рэцэсіі».

БЕЛТА.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

*Мінчане **ВАСІЛЕЎСКІЯ Аляксей і Кацярына** сталі шчаслівымі бацькамі адразу трох дачушак. Таццяна, Аленка і Анютка адчуваюць сябе цудоўна. Мама-парадзіха таксама. Учора бацька, не хаваючы здзіўлення і радасці, забраў сваё рэзка ўзрослае сямейства з раддома — НПЦ «Маці і дзіця».*

Завочная прамая лінія

Усё, што датычыцца гульні нацыянальнай зборнай па футболе, аб прычынах не зусім удалага старту ў адборачным цыкле да чэмпіянату свету-2010 і планах на будучыню, аб выніках работы ў Беларусі нямецкага спецыяліста вы можаце распытаць **галоўнага трэнера беларускай каманды Бернда ШТАНГЕ.** Адказы можна будзе атрымаць непасрэдна праз публікацыю ў газеце «Звязда». Пытанні пакідайце па нумары (8017) 287 18 72 або на электронны адрас alena-zvd@tut.by да 5 снежня.

«Прамая лінія»

ПЕНСІІ: УСЁ, ШТО ВАМ ЦІКАВА

Пенсійная тэма — актуальная заўсёды. І сведчаннем гэтага становяцца званкі ў рэдакцыю, вынікам якіх стала рашэнне правесці чарговую «прамую лінію» са спецыялістамі Міністэрства працы і сацыяльнай бароны. Асаблівасці падліку стажу, індывідуальнага каэфіцыенту, надбаўкі, магчымасці датэрміновага выхаду на заслужаны адпачынак — аб усім гэтым і іншым мы прапануем вам пагутарыць з **намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валерыем Валер'евічам КАВАЛЬКОВЫМ.**

Наша «прамая лінія» ***12 снежня адбудзецца з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.***

Рэпартаж з колаў

«ЗВЯЗДА» ТРЫМАЕЦЦА НА ЛЮБОВІ»

…Знаёмы пажарнік казаў, што работа ў яго ў прынцыпе добрая. Але ж як пажар, дык хоць ты звальняйся.

У журналістаў (дакладней — журналістак) штось агульнае з гэтым ёсць, бо як камандзіроўка… Не, бедства не стыхійнае, але ж нейкія справы (службовыя, хатнія) трэба пасунуць-адкласці, рэчы сабраць, апрануцца…

Гэта мужыкам «не пытанне». Адзін (мы ў Лідзе пачулі) — куфайку дзяжкай падперазаў, шапку на вочы нацягнуў, кажа: «Халера з ім, што непрыгожа, галоўнае — цёпла». Жанчына прыбралася… Не будзем пералічваць, у што, бо не так гэта важна. Важна, што вечарам сказала тое ж: «Халера з ім, што… галава і ногі адмерзлі, затое прыгожа было!».

У дарогу — ці трэба казаць? — так не прыбярэшся, з надвор'ем не згадаеш, з гасцінцай таксама. Да таго ж на слабы пол яны і наогул мала разлічаны…

Зрэшты, гэта так, да слова. Слова пра тое, што маленькі звяздоўскі дэсант у чарговы раз рушыў у дарогу. І ў чарговы раз, дзякаваць богу, вярнуўся — чаго толькі ні пабачыўшы, чаго ні пачуўшы!

…Заўсёды і з нязменным задавальненнем (праўда, пакуль, без суперпрызоў… Чамусьці…) едзем на Вілейшчыну. Там — жывуць героі нашых публікацый (былых і, зразумела ж, будучых), там — любімыя аўтары, там у газеты больш за 550 падпісчыкаў (у большасці, зразумела ж, індывідуальных).

— Са «Звяздой» паштальёнам працаваць не цяжка, — зазначыла начальнік аддзела падпіскі Вілейскага РВПС Таццяна Патаповіч. — Ад газеты людзі, як правіла, не адмаўляюцца: паглядзіце — з квартала ў квартал адна і тая ж колькасць падпісчыкаў на 1-й гарадской пошце, на вясковых Даўгінава, Ілья, Лыцавічы, Нарач… Выпісваюць газету амаль усе бібліятэкі, амаль усе школы, бальніцы. Бо цікавая. Я і сама шмат чытаю. Ведаю, што ў раёне ёсць вашы падпісчыкі з 50-гадовым «стажам»!



Сціплы сувенір — першаму падпісчыку Зігмунду ЛУЖЫНСКАМУ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Уладальнікі суперпрыза сужэнцы БАРБАШЫНСКІЯ.

Кожнаму з іх, ну зразумела ж, хацелася б перадаць і прывітанне, і пажаданне яшчэ доўгіх гадоў жыцця. Прычым — шчаслівага. Таму ў сценах райвыканкама мы з задавальненнем пакінулі чароўны гадзіннік (з лагатыпам газеты), які, як сведчаць тыя, хто яго атрымаў, па-першае, прыносіць удачу, а па-другое, што таксама важна, ніколі не падманвае…

У адрозненне ад Вілейкі, гораду Маладзечна, Маладзечанскаму раёну на звяздоўскія прызы шанцуе. Тут, калі памяць не падводзіць, працуюць як мінімум чатыры нашы тэлевізары, мікрахвалевая печ, адзін халадзільнік. Ну, зразумела ж, цудоўна помняцца іх гаспадары. І так хацелася б ведаць, як жывыя-здаровыя!?.. Так хацелася б (па дарозе!) зазірнуць на аддзяленні сувязі, дзе, як і ў тым Вілейскім раёне, з месяца ў месяц «трымаецца» тыраж «Звязды», наведаць сваіх падпісчыкаў, выслухаць іх заўвагі, парады. Але…

Як амаль заўсёды, нас прыспешваў гадзіннік: мы баяліся спазніцца ў Валожын, дзе, ведалі, нас з нецярпеннем чакаюць Ганна Рыгораўна і Браніслаў Іванавіч Барбашынскія. Прыемна, што прыйшлі яны не адны — запрасілі сваіх свякоў, сяброў. У тым ліку і па той простай прычыне, што… загітавалі і іх падпісацца на «Звязду» (адна са свячак, праўда, адбівалася, казала: «А навошта мне ваенная газета?»)… Пэўную работу (шчыры дзякуй ім!) правялі і валожынскія ідэолагі, паштавікі. Так што хай у невялічкай, але ж зале цэнтральнай бібліятэкі свабодных месцаў, лічы, не было. Дэфіцыту ўвагі і цеплыні — таксама.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

КРЕСТЬЯНСКОЕ ХОЗЯЙСТВО
реализует
лук репчатый по цене 400 руб/кг.
Форма оплаты — любая.
КОНТАКТНЫЙ ТЕЛ.
8 033 663 37 62,
8 033 665 30 54.
УНП 600259565

Тарыф на транзіт нафтапрадуктаў з 1 студзеня павялічваецца ў паўтара раза

Удзельны тарыф на транзіт нафтапрадуктаў па тэрыторыі Беларусі з 1 студзеня 2009 года павялічваецца на 52,8 працэнта і складзе $1,36 за тону нафтапрадуктаў, перамешчаных на адлегласць 100 км.

ISSN 1990 - 763X

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже гаражей, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Будславская, 21, территория ГСК «Новинки»:

Номера лотов	Номера гаражей	Общая площадь (кв.м)	Начальная цена одного лота с НДС
1 – 47	988 – 989; 993 – 1018; 1031 – 1047; 1049 – 1052	от 35,6 до 39,9	6 814 302
48 – 49	1027 – 1028; 1029 – 1030	70,9; 72,4	12 043 318

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.09.2007 г. Аукцион состоится **24.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.
Контактный тел: (8017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.
УНП 690324015.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 5.12.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 174,00
1 еўра	2 729,67
1 латвійскі лат	3 846,77
1 літоўскі літ	790,13
1 чэшская крона	105,77
1 польскі злоты	703,26
1 расійскі рубель	77,76
1 украінская грыўня	289,87

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	27,9576
10 UAH	35,3887
1000 BYR	13,0521
EUR	37,2768

Курс у гандлёвых кампаніях (на 4.12.2008 г.)

USD	2175 / 2250

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.
ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Магілёўскага дзяржуніверсітэта імя А.А. Куляшова з 95-годдзем ВНУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова з 95-годдзем з дня заснавання ВНУ.

Больш як 53 тысячы выпускнікоў ВНУ паспяхова працуюць на прадпрыемствах, у органах улады, навукова-даследчых арганізацыях, установах адукацыі і культуры. Сярод яе былых студэнтаў — Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, вядомыя вучоныя, пісьменнікі, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы. «Успаміны аб студэнцкіх гадах, праведзеных у сценах роднай ВНУ, нязменна абуджаюць у маім сэрцы самыя цёплыя і добрыя пачуцці. У гэты святочны дзень словы асаблівай удзячнасці выказваю выкладчыкам, якія многім выпускнікам дапамаглі стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, дастойнымі грамадзянамі краіны», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь цэніць адносіны з Індыяй

Беларусь цэніць адносіны з Індыяй і ганарыцца імі, заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы 4 снежня з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Індыі ў Беларусі Раджэндрам Кумарам Цягі з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў паслу Індыі за яго дзейнасць па ўмацаванні двухбаковых адносінаў з Беларуссю. Прэзідэнт падкрэсліў, што за перыяд яго дыпламатычнай місіі беларуска-індыйскі тавараабарот значна ўзрос. Па выніках мінулага года аб'ём тавараабароту склаў $183 млн. За 10 месяцаў гэтага года ён значна павялічыўся і дасягнуў $351,3 млн. Разам з тым лідэрамі дзвюх краін вызначана стратэгічная задача — павелічэнне да 2010 года аб'ёму двухбаковага тавараабароту да $500 млн. На думку пасла, сур'ёзны імпульс беларуска-індыйскаму ўзаемадзеянню надаў візіт у Індыю Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў красавіку 2007 года (кіраўнік беларускай дзяржавы наведваў Індыю двойчы, першы раз у 1997 годзе).

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У нядзелю пахаладае і пойдзе мокры снег

У пятніцу і суботу на большай частцы краіны будзе ісці дождж. У пятніцу ўдзень па ўсходзе чакаецца ўзмацненне ветру да 15—19 м/с, тэмпература паветра 6—12 цяпла. У суботу тэмпература ўначы ад 0 да плюс 6, удзень — 3—9 цяпла. У нядзелю ўначы месцамі, а ўдзень амаль паўсюдна будзе ісці мокры снег ці дождж. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, удзень — ад 0 да 6 цяпла. У пачатку наступнага тыдня месцамі зноў будзе ісці снег і мокры снег, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — 1—4 цяпла. Новы год абяцаюць са снегам.

Сяргей КУРКАЧ.

Па той бок прылаўка

КОШТ АЛЕЮ ДА ВЯСНЫ МОЖА ЗНІЗІЦЦА ЯШЧЭ

На радасць звычайнага пакупніка, цэны на алей апошнім часам пачалі пакрысе зніжацца. Хоць яшчэ адносна нядаўна кошт бутэлькі гэтага прадукту павялічваўся калі не штодня, дык кожны тыдзень дакладна. Тады сітуацыя тлумачылася неўраджаем сланечніку ў той жа Украіне. Уласны алей са сланечніку наша краіна, як вядома, не вырабляе. Мы нават не завозім «семачку», бо гэта фактычна азначае вазіць паветра — з-за яе вагі. У Беларусь увозіцца ў цыстэрнах гатовы алей, які тут, калі трэба, дачышчаецца, купажуецца (змешваецца з рапсавым) і разліваецца ў бутэлькі, удакладнілі нам у канцэрне «Белдзяржхарчпрам». Дык з чым канкрэтна звязана патанненне алею і чаго спажыўцам трэба чакаць у перспектыве ў плане цаны на гэты патрэбны харчовы прадукт? Каментарый мы атрымалі ў прадстаўніка аднаго з асноўных імпарцёраў сланечнікавага алею ў Беларусь.

— Усё рэгулюе рынак, усё пачынаецца з кошту сыравіны, закупачнай цаны, — сказалі рэдакцыі. — Летась з-за неўраджаю яна сапраўды была «завоблачнай». Сёлета ж быў атрыманы багаты ўраджай. Гэта адна з прычын патанення алею. Кантрактныя цэны, можна сказаць, усталяваліся зараз на узроўні да сярэдзіны 1999 года. Прагназуецца, што яны могуць упасці яшчэ на 10—15 працэнтаў — да ўзроўню, які быў у 1997 годзе. Гэта азначае, што рознічныя цэны могуць знізіцца яшчэ прыкладна на 10 працэнтаў. Далей ужо нельга, гэта мяжа.

Яшчэ адной прычынай зніжэння цаны з'яўляецца фінансавая сітуацыя ў суседніх краінах.

— Ва Украіне, ды ўжо і ў Расіі, скідваюць цану, каб, па-першае, хутчэй атрымаць няхай і крыху меншыя, але «жывыя» грошы, па-другое, не затарваць склады. Гэта невялікія страты ў параўнанні, скажам, з прыпыненнем вялікай вытворчасці. Ды і прадаюць пакуль прадукцыю пачатку ўраджаю, які, нагадаю, быў добрым, — зазначыў прадстаўнік кампаніі-імпарцёра.

Аднак, паводле яго далейшых выказванняў, аналітыкі ўжо ўвесну прагназуюць павышэнне цаны на алей. Такім чынам, айчынныя спажыўцы да гэтага часу, калі такія меркаванні спраўдзяцца, могуць асабліва не хвалявацца і не рабіць вялікіх запасаў алею. Як пажартаваў суразмоўца, на ўсё жыццё ўсё роўна не назапасішся, ды і прадукт гэты мае абмежаваны тэрмін захоўвання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Мінсельгасхарч да канца года не плануе павышэння закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю

Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік галоўнага ўпраўлення эканомікі Мінсельгасхарча Тамара Вусько.

Паводле яе слоў, у гэтым годзе павышэнне закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю было звязана з неабходнасцю пакрыцця затрат на яе вытворчасць, кампенсацыі росту цэнаў на матэрыяльныя рэсурсы і выраўноўвання цэнаў на аналагічную прадукцыю з суседнімі краінамі. «Мы заўсёды адсочваем узровень закупачных цэнаў на сыравіну ў суседніх дзяржавах і праводзім тактыку выраўноўвання, каб абараніць інтарэсы айчынных вытворцаў і не дапусціць несанкцыянаванага адтоку гатовай прадукцыі», — сказала спецыяліст.

Цяпер у сувязі з сусветным фінансавым крызісам сітуацыя рэзка змянілася. Знізіліся цэны на гаручае, мінеральныя ўгнаенні. Цэны на прадукты харчавання таксама пачалі падаць. Напрыклад, знізіліся экспартныя цэны на малако. Беларуская малочная прадукцыя становіцца неканкурэнтаздольнай на знешнім рынку па цэнавым фактары. Так, у верасні экспартныя цэны ў параўнанні са студзенем гэтага года на сметанковае масла знізіліся на 16,1 працэнта, цвёрдыя сыры — на 23,8 працэнта, сухое натуральнае малако — на 28,6 працэнта, сухое абястлушчанае малако — на 31,9 працэнта. Існуючы ўзровень экспартных цэнаў не забяспечвае рэнтабельнасць продажаў беларускім вытворцам. Паводле апошніх звестак, цэны на сметанковае масла на біржавых таргах упалі да $2 за 1 кг, хоць яшчэ нядаўна яго прадавалі па $3,3.

Паўстае пытанне аб магчымым зніжэнні закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю, каб канчаткова не страціць перапрацоўку. Такую думку выказаў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён Шапіра на пасяджэнні калегіі ведамства.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

Пры скасаванні дагавора рознічнай куплі-продажу і вяртанні грошай спажывец не павінен прад'яўляць пашпарт

«У краме на праспекце набыла жаночыя боцікі. Спадабаўся і фасон, ды і цану «перажыць» можна было. Аднак дома зразумела, што з пакупкай паспяшалася: новы абутак «сядзеў» на нагах не так, як хацелася б. Літаральна назаўтра паехала ў той жа магазін: хоць і шкада было, аднак прыняла рашэнне вярнуць за боцікі грошы. Прад'явіла чэк і мне, у прынцыпе, не адмовілі, аднак запатрабавалі пашпарт. Маўляў, даныя з яго патрэбны пры запаўненні бланка на вяртанне грошай. Не буду казаць як, але ў мяне атрымалася «выкруціцца» ў гэтай сітуацыі. А ўвогуле цікава: ці сапраўды пашпарт абавязкова патрэбны ў такіх выпадках? Калі дакладна не ведаеш, не будзеш жа кожны дзень проста так насіць гэты дакумент».



Шчыра кажучы, гэтае пытанне мінчанкі не здзівіла: самому даводзілася сутыкацца з аналагічнай сітуацыяй. Тое ж пацвердзілі нам і ў Міністэрстве гандлю.

— Сапраўды, за апошні час выпадкі зваротаў да нас грамадзян па пытаннях скасавання дагавораў рознічнай куплі-продажу пачасціліся. І менавіта ў згаданым кантэксце: гандлёвыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі пры скасаванні такіх дагавораў і вяртанні наяўных грашовых сродкаў патрабуюць, каб спажывец афарміў заяву і прад'явіў дакумент, які сведчыць асобу, — сказалі нам ва ўпраўленні абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай міністэрства.

А як павінна быць насамрэч? Якія тут правы ў спажыўцоў? Што могуць патрабаваць прадстаўнікі гандлю ад пакупніка?

У адпаведнасці з часткай першай артыкула 422 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пагадненне аб змяненні ці скасаванні дагавора здзяйсняецца ў той жа форме, што і дагавор, калі з заканадаўства або дагавора не вынікае іншае. Гэта па-першае. Па-другое, Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў», Правіламі ажыццяўлення рознічнага гандлю асобнымі відамі тавараў і грамадскага харчавання не ўстаноўлена патрабаванне аб заключэнні (скасаванні) дагавораў рознічнай куплі-продажу шляхам афармлення заявы і прад'яўленні дакументаў, што сведчаць асобу.

Калі гаварыць пра гандаль, можна прыгадаць Інструкцыю аб парадку выкарыстання юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі касавых падсумоўваючых апаратаў, спецыяльных камп'ютарных сістэм, білетадрукавальных машын, таксометраў для прыёму наяўных грашовых сродкаў і (ці) банкаўскіх пластыкавых картак у якасці сродку аплаты тавараў, выкананні работ і аказанні паслуг. Верагодна, менавіта на гэты дакумент і спасылаюцца ў спрэчных сітуацыях работнікі гандлю. У ім сапраўды можна назваць пункт 14, згодна з якім, у выпадку вяртання пакупніку (спажыўцу) наяўных грошай (прынятых вышэйпералічанымі спосабамі), складаецца акт аб вяртанні па форме, згодна з дадаткам 2 да Інструкцыі.

— Формай гэтага акта прадугледжаны канкрэтныя рэквізіты, якія падлягаюць запаўненню. Шэраг з іх — пры наяўнасці. Іншых патрабаванняў у частцы афармлення вяртання наяўных грашовых сродкаў пакупніку Інструкцыяй не ўстаноўлена, — паведамілі рэдакцыі ў Мінгандлю. — Такім чынам, гандлёвыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі пры скасаванні дагавора рознічнай куплі-продажу і вяртанні наяўных грошай не маюць права патрабаваць у спажыўца афармлення заявы і прад'яўлення пашпарта.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Абзац

■ У кожнай пятай расійскай кампаніі карпаратыўнае святкаванне Новага года будзе адмененае па прычыне фінансавага крызісу. Такія вынікі апытання, праведзенага даследчым цэнтрам партала SuperJob.ru сярод 1000 прадстаўнікоў расійскіх фірмаў.

■ **Брастаўчанін добраахвотна здаў у міліцыю двухствольнае паляўнічае ружжо 1896 года выпуску. Рашэнне расстацца з рарытэтам ён прыняў з-за таго, што зарэгістраваць ружжо, не набытае на законных падставах, у Беларусі нельга, між тым незаконнае захаванне зброі пагражае непрыемнасцямі. Не выключана, што ружжо зойме месца ў музеі — слова за экспертамі. Па кляйму на зброі ўстаноўлена, што вырабіў яе ў Празе майстар Навотны. Вядома, што гэты збраяр вырабіў усяго каля 300 адзінак такой зброі.**

■ У Іванаўскай вобласці вынесены прысуд жанчыне, якая па-зверску зарэзала супрацоўніка міліцыі. Канфлікт «начнога матылька» са сваім кліентам адбыўся падчас аказання інтымных паслуг. Яшчэ ў маі супрацоўнік упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю вярнуўся з камандзіроўкі на Паўночны Каўказ і ў вольны ад службы час запрасіў да сябе прастытутку па выкліку. Падчас аказання інтымных паслуг паміж імі ўзнікла сварка, і жанчына нанесла пацярпеламу 14 удараў нажом, ад чаго той памёр. Пасля забойства прастытутка скрала з кватэры маёмасці на 1 тыс. долараў. У калоніі агульнага рэжыму яна правядзе 10 гадоў.

■ **Урад Літвы рыхтуе папраўкі ў Адміністрацыйны кодэкс, у адпаведнасці ў якімі ў краіне будуць уведзеныя буйныя штрафы за з'яўленне на працы ў стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення. У дзеючым кодэксе адказнасці за такія парушэнні няма. Работнік, якога злавілі п'яным, можа быць аштрафаваны на суму ад 36 да 110 долараў, а кіраўніку, калі ён не будзе прымаць мераў па барацьбе з п'янствам сярод сваіх працаўнікоў, пагражае больш буйны штраф: ад 364 да 1100 долараў.**

■ Папулярны брытанскі акцёр Х'ю Грант паабедаў з былым прэзідэнтам СССР Міхаілам Гарбачовым. За гэта яму давялося аддаць 400 тысяч долараў. Абед з экс-прэзідэнтам Савецкага Саюза быў адным з лотаў дабрачыннага аўкцыёна, праведзенага ў Лондане фондам Гарбачовай. Сабраныя грошы будуць накіраваныя на дапамогу дзецям, хворым на лейкемію. Кампанію Гранту і Гарбачову склаў яшчэ адзін бізнэсмен, імя якога не называецца. У складчыну з акцёрам яны выклалі за гэты незвычайны лот 700 тыс. долараў.

■ **Міжведамасная камісія выбера пляцоўку для будаўніцтва АЭС у Беларусі да канца снежня. Пасяджэнне камісіі намечана на 22—23 снежня.**

■ Напярэдадні Новага года, абяцаюць сіноптыкі, у Беларусь прыйдзе чарговая хваля прахалоднага атлантычнага паветра. Сіноптыкі прагназуюць надвор'е са слабым ветрам, невялікім снегам і умераным марозам. У навагоднюю ноч снег захаваецца, а слупок тэрмометра пакажа мінус 2 — мінус 7 градусаў. Але сінаптычная сітуацыя будзе ўдакладняцца, папярэджваюць сіноптыкі.

■ **У Віцебску па гарачых слядах затрыманы гвалтаўнік. Злачынства было ўчынена ў канцы лістапада. Пагражаючы асколкам разбітай бутэлькі, злачынец згвалціў 19-гадовую дзяўчыну. Ахвяра знайшла ў сабе сілы адразу ж звярнуцца ў праваахоўныя органы. Па складзеным ёй фотаробаце ўжо на наступны дзень быў затрыманы малады чалавек 1989 г.н. Цяпер ён даў прызнальныя паказанні. Яму пагражае да 7 гадоў пазбаўлення волі.**

■ Надпіс «Курэнне забівае» з'явіцца на пачках цыгарэт у Расіі. Гэта прадугледжана Тэхнічным рэгламентам на тытунёвую прадукцыю, прынятым учора Дзярждумай. Надпіс павінен быць абведзены рамкай чорнага колеру. На ўпакоўцы могуць быць размешчаныя і дадатковыя папярэджанні, такія, як «Курэнне выклікае інфаркты і інсульты», «Абараніце дзяцей ад тытунёвага дыму», «Звярніцеся да ўрача, каб кінуць курыць».

■ **У вольны ад заняткаў час 16-гадовы вучань з Эсекса (Вялікабрытанія) зарабляе 30 тыс. фунтаў стэрлінгаў ($44,25 тыс.) у месяц. Гары Купер і яго чатыры падначаленыя займаюцца он-лайн-продажамі мабільных тэлефонаў. Гэта не перашкаджае юнаку паспяваць па ўсіх прадметах у школе. Гары ўпэўнены, што праз некалькі гадоў яго кампанія заробіць свой першы мільён. Пакуль з агульных даходаў ён выплачвае сабе 500 фунтаў стэрлінгаў ($737,4) і збірае на маторную лодку.**

Поўны абзац

■ Любоў жыхароў акругі Перы ў амерыканскім штаце Алабама да выбранага прэзідэнта Барака Абамы, падобна на тое, не ведае межаў. Акружная камісія прыняла пастанову, згодна з якой штогод будзе адзначацца свята пад назвай Дзень Барака Абамы. Згодна з прынятым рашэннем, дзень прысвечаны перамозе Абамы на прэзідэнцкіх выбарах і будзе адзначацца кожны другі панядзелак лістапада. У гэты дзень не будуць працаваць усе акруговыя службы, а іх супрацоўнікі атрымаюць законны выхадны. На выбарах за Абаму прагаласавалі каля 70 працэнтаў жыхароў акругі, большасць яе насельнікаў — афраамерыканцы.

■ **У горадзе Здалбунова Ровенскай вобласці перавыхоўваць п'яных вадзіцеляў будуць на могілках. Мясцовыя могілкі знаходзяцца не ў лепшым стане, і праца злоўленых нецвярозых вадзіцеляў будзе тут да месца. Кіроўцы аўтамабіляў атрымліваюць па 60 гадзін працы, скутараў — па 50. Заадно яны маюць магчымасць па-філасофску падумаць аб выніках парушэння правілаў дарожнага руху. Месца абавязвае.**

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПУЦІН: ЗША ЗАРАЗІЛІ КРЫЗІСАМ УВЕСЬ СВЕТ, АЛЕ РАСІЯ ВЫСТАІЦЬ



Учора адбылася шырока разрэкламаваная расійскімі СМІ «прамая лінія» з прэм'ерам РФ — «Гутаркa з Уладзімірам Пуціным». Упершыню Пуцін у такім фармаце адказваў на пытанні сугромадзян не як прэзідэнт, а як прэм'ер і лідар «Адзінай Расіі». З пытаннямі ў яго адрас паступіла 1 млн 310 тысяч тэлефонных званкоў і 550 тысяч смс-паведамленняў.

Сёлета прэм'ер Пуцін не адразу пачаў з пазітыўных эканамічных лічбаў, а надаў увагу надзённай праблеме — фінансаваму крызісу, а менавіта, яго вінаватым. Крызіс, паводле меркаванняў Пуціна, пачаўся ў ЗША, якія давялі да гэтага сваю эканоміку, а затым заразілі ім усе эканомікі свету.

Затым прэм'ер перайшоў да эканомікі Расіі і заявіў, што нават ва ўмовах крызісу ў Расіі ў 2008 годзе зафіксаваны рост эканомікі — 6,8-6,9 працэнта. Зрэшты, Пуцін прагназуе складаны перыяд у эканоміцы. І расіянам трэба быць да яго гатовымі палітычна і маральна. Але, паводле меркавання Пуціна, у Расіі ёсць усе шанцы мінуць сусветны фінансавы крызіс з мінімальнымі стратамі.

ІНФЛЯЦЫЯ

Па выніках года інфляцыя ў Расіі, хутчэй за ўсё, выйдзе на паказчык у 13 працэнтаў, заявіў прэм'ер-міністр. Звязана гэта з сусветным крызісам і з тым, што Цэнтральны банк і Мінфін змушаныя былі ўкінуць у эканоміку вялікі аб'ём ліквіднасці грашовых сродкаў.

САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА

Нягледзячы на цяжкасці, сацыяльныя абавязанні і інвестыцыйныя планы ўрада не будуць скарачацца. «Усё, што мы планавалі ў сацыяльнай сферы, усё, што звязана з павышэннем сацыяльных дапамог, пенсій, — усё будзе выконвацца», — паабяцаў Пуцін.

КУРС РУБЛЯ

У Расіі назапашана досыць рэзерваў, каб пераадолець усе негатыўныя з'явы фінансавага крызісу. «Мы трэцяя краіна ў свеце па аб'ёмах золатавалютных рэзерваў», нагадаў Пуцін. Рэзкіх скачкоў у эканоміцы і нацыянальнай валюце не будзе.

УКРАІНА ДАГЭТУЛЬ НЕ ЗАПЛАЦІЛА ЗА ГАЗ. АЛЕ Ў РФ ЁСЦЬ РЫЧАГІ, ДАКЛАДНЕЙ, КРАНЫ...

У выпадку невыканання Украінай абавязацельстваў па транзіце газу ў Заходнюю Еўропу Расіі давядзецца скарачаць аб'ёмы паставак паліва, заявіў прэм'ер-міністр РФ. «А што нам рабіць, куды нам падзецца?» — запытаўся Пуцін. Ён паведаміў, што «хуткім часам расійскі бок мае намер праінфармаваць партнёраў у Заходняй Еўропе аб гэтай сітуацыі».

Кажучы аб кошце расійскага газу, які будзе пастаўляцца ва Украіну ў наступным годзе, Пуцін адзначыў, што «Расія не можа пакінуць кошты бягучага года на ранейшым узроўні». Ён падкрэсліў, што «нават сёння Украіна дагэтуль атрымлівае ад Расіі газ амаль удвая танней, чым Еўропа».

ПУЦІН «ВЕЛЬМІ РАЗЛІЧВАЕ» НА НОВАГА ПРЭЗІДЭНТА ЗША

Расія «вельмі разлічвае» на пазітыўныя змены ў адносінах з ЗША пасля абрання прэзідэнтам Барака Абамы. «Мы вельмі разлічваем, што будуць пазітыўныя змены ў адносінах з ЗША, і цяпер такія сігналы паступаюць, — сказаў Пуцін. — Мы бачым, што не спяшаюцца з прыняццем у НАТА Грузіі і Украіны, размяшчэннем радара ў Польшчы».

ДАЎЖНІКОЎ ПА ІПАТЭЦЫ НЕ БУДУЦЬ «КАШМАРЫЦЬ»

Пуцін заклікаў банкі «не кашмарыць» сваіх даўжнікоў, узмацняючы жорсткасць умоў і скарачаючы тэрміны выплат па іпатэчных крэдытах, паабяцаўшы выдаваць банкірам дзяржгарантыі.

У 2009 ГОДЗЕ БЕНЗІН ПАТАННЕЕ

Пуцін прызнаў, што прычынай высокіх коштаў на бензін у Расіі з'яўляецца імкненне нафтавых кампаній «захаваць хоць нейкія прыбыткі за кошт унутранага спажыўца». Аднак, удакладніў прэм'ер, урад мае намер працягваць зніжаць падатковую нагрузку на нафтавыя кампаніі ў надзеі, што гэта адаб'ецца на коштах у Расіі.

Страты расійскіх нафтавых кампаній сёння складаюць 68 долараў з кожнай экспартуемай тоны, паведаміў прэм'ер.

АБМЕЖАВАННЯЎ НА ВЫВАЗ І ЎВОЗ ВАЛЮТЫ НЕ БУДЗЕ

Расія не будзе вяртацца да абмежаванняў на ўвоз і вываз валютнай выручкі. «Мы не збіраемся ніяк абмяжоўваць тыя ліберальныя правілы ўвозу і вывазу валюты і грошай наогул, якія мы ўвялі з 1 ліпеня 2006 года, калі цалкам перайшлі да лібералізацыі валютнага рынку», — паведаміў у прамым тэлеэфіры Уладзімір Пуцін.

ЗБЕРАЖЭННІ — У РУБЛЯХ!

Расіянам лепш захоўваць зберажэнні «пераважна ў рублях». Такое меркаванне выказаў прэм'ер-міністр.

«У чым захоўваць грошы — гэта выбар кожнага чалавека... Для тых, хто жыве ў Расіі, купляе тут тавары, паслугі, вядома, лепш аддаць перавагу рублю», — лічыць Пуцін.

Погляд

Пуцін супакоіў Расію?

Зніжэнне ўзроўню заработнай платы ў Расіі не будзе. Наадварот, зарплата вырасце. Паводле яго слоў, дзяржава будзе напрамую падтрымліваць прадпрыемствы і не дапусціць масавага беспрацоўя. Хоць яно трохі вырасце, прызнаў старшыня ўрада і, магчыма, у 2009 годзе дасягне лічбы больш за два мільёны. Сёння, нагадаў ён, у Расіі больш за 1 700 000 афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных.

Пуцін сказаў, што ўрад таксама і надалей будзе падтрымліваць буйныя сістэмастваральныя банкі, якія захоўваюць грошы мільёнаў расійскіх укладчыкаў і не разбазараць іх. Падтрымку адчуе малы і сярэдні бізнэс. Увогуле вялікія золатавалютныя рэзервы дазваляюць пазбягаць моцных ваганняў курсу рубля, таму якіх-небудзь рэзкіх рухаў на грашовым рынку з нацыянальнай валютай не будзе.

Карацей кажучы, У. Пуцін супакоіў і абнадзеіў Расію. У цэлым жыхары Расіі, ды і не толькі яны, атрымалі з вуснаў старшыні ўрада цікавую і змястоўную інфармацыю.

Упэўнены, за перыпетыямі сённяшняга эканамічнага жыцця Расіі ўважліва сочаць і сотні тысяч жыхароў Беларусі, асабліва тыя, праца якіх у той ці іншай ступені звязана з кааперацыяй з расійскімі прадпрыемствамі і партнёрамі, выкананнем іх заказаў, паставак у Расію прадуктаў харчавання і г.д. Так, сёлета, нягледзячы на негатыўныя знешнія фактары і іх наступствы, аб'ём узаемнага гандлю Беларусі і Расіі значна пераўзыдзе мінулагодні паказчык і будзе вагацца ў межах 34 млрд долараў ЗША. Факт, безумоўна, прыемны і абнадзейвальны. Ён усяляе аптымізм, што, магчыма, і налета захаваецца станоўчая дынаміка гандлёва-эканамічных адносінаў.

Але чамусьці ўсё ж узнікае трывога. Па ацэнках некаторых маскоўскіх аналітыкаў і эканамістаў, Расія адчуе дно крызісу вясной наступнага года. Як тады ў новых умовах павядзе сябе наш стратэгічны саюзнік? Ці не станем мы сведкамі выбуху эканамічнага эгаізму Расіі, з праявамі якога мы перыядычна сутыкаліся і сутыкаемся нават у час стабільнай сітуацыі? Скажам, нечаканае стварэнне праблем для продажу беларускага цукру ў Расіі. Ці пастаянныя прыдзіркі і абмежаванні да беларускага імпарту малочных і мясных прадуктаў харчавання. Хацелася б памыліцца, але здаецца, што ў 2009 годзе вытворцы апошніх сутыкнуцца з новымі праблемамі. У размове Пуцін адзначыў, што ўрад стараецца па меры магчымасці абмяжоўваць імпарт так званага чырвонага мяса, напрыклад, ялавічыны, свініны і нават мяса птушкі. Не ўсё зразумела з пастаўкамі газу ў 2009 годзе. Не выключана, што Газпрам можа выставіць цану ў 200 долараў ЗША за тысячу кубаметраў.

Як загадзя паведаміла прэс-служба расійскага прэм'ер-міністра, У. Пуціну было вельмі важна з першых рук атрымаць інфармацыю аб рэальных праблемах краіны, пачуць ад людзей іх ацэнку таго, што атрымліваецца ў дзейнасці ўрада, а што мае патрэбу ў карэкціроўцы. Будзем спадзявацца, што змест і ўзровень эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі калі і будзе зкарэктаваны, то ў лепшы бок.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

У свеце

МУМБАЙСКАМУ ТЭРАРЫСТУ ЎВЯДУЦЬ «СЫРОВАТКУ ПРАЎДЫ»

Адзінаму захопленаму жывым тэрарысту, які ўдзельнічаў у нападзе на горад Мумбаі, будзе ўведзена так званая «сыроватка праўды».

Гэта неабходна, каб «раз і назаўсёды» высветліць паходжанне 21-гадовага (па іншых звестках, 24-гадовага) Азама Аміра Кабаса. Індыйскія паліцэйскія сцвярджаюць, што ён родам з вёскі Фарыдкот у пакістанскай частцы Пенджаба, у той час як прэзідэнт Пакістана выказаў у гэтым сумненне. Па словах Асіфа Алі Зардары, у пакістанскіх спецслужбаў «няма істотных доказаў» таго, што затрыманы тэрарыст — пакістанец. «Баевікі, а таксама арганізатары тэрактаў (у Мумбаі) — гэта асобы без грамадзянства, якія ўзялі ў закладнікі ўвесь свет», — патлумачыў прэзідэнт Пакістана. Аднак індыйскія спецслужбы высветлілі, што арганізатары тэрактаў паабяцалі заплаціць сям'і Кабаса 100 000 пакістанскіх рупій (каля 1250 долараў ЗША), калі ён загіне, «змагаючыся за ісламе». Таксама стала вядома, што малады тэрарыст быў рознарабочым, перш чым уступіць у рады тэрарыстычнай групоўкі «Лашкар-і-Тайба». Бацька Кабаса прадставіў яго аднаму з верхаводаў тэрарыстаў, за што атрымаў узнагароджанне.

100 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ АДНОЙ КУПЮРАЙ

Урад Зімбабве ўвёў у абарачэнне купюру коштам 100 мільёнаў зімбабвійскіх долараў.

На гэты крок улады вымушаны пайсці з-за высокіх тэмпаў інфляцыі, якая штомесячна абнаўляе суветны рэкорд. Рэзервовы банк краіны выпусціць купюры ў 10, 50 і 100 мільёнаў долараў. Пры гэтым у лістападзе былі прадстаўлены купюры коштам 100 тысяч, 500 тысяч і мільён зімбабвійскіх долараў.

На чорным рынку 100-тысячная купюра каштуе ўсяго адзін долар ЗША. Пры гэтым батон хлеба каштуе два долары ЗША. На канец верасня 2008 года 12-месячны рост спажывецкіх цэнаў склаў 231 мільён працэнтаў. У жніўні Зімбабве правяло дэнамінацыю, у ходзе якой з купюры зімбабвійскага долара знялі 10 нулёў.

ЯПОНЦЫ ЗРАБІЛІ НАВАГОДНЯЕ ДРЭВА З ЗОЛАТА



Японскія ювеліры стварылі калядную ёлку з золата.

Яе вага складае каля 24 кілаграмаў. Каштуе навагодняе ўпрыгажэнне каля 1 мільёна фунтаў стэрлінгаў (каля 1,5 мільёна долараў ЗША). Па словах ювеліраў, яна створыць у інтэр'еры «шыкоўную атмасферу». Дрэва ўпрыгожана 240 каштоўнымі камянямі, у тым ліку брыльянтамі, а таксама жамчужнымі ніткамі. Патэнцыяльныя пакупнікі могуць азнаёміцца з ялінай у ювелірным магазіне Гінзы Танакі ў горадзе Осака на востраве Хансю. «У нашым магазіне вы забудзецеся пра ўсё, у тым ліку і пра глабальныя эканамічныя праблемы», — гаворыцца ў рэкламным рэлізе Танакі.

ШАКАЛАД, ЯКІ НЕ ПСУЕ ЗУБЫ

У Бельгіі стварылі першы ў свеце шакалад, які абсалютна бясшкодны для зубной эмалі.

У яго складзе замест традыцыйнай цукрозы выкарыстоўваецца ізамальтулоза. Гэта таксама цукар. Па словах брусельскіх кандытараў, «адзінае і галоўнае адрозненне ў тым, што пры ўжыванні ізамальтулозы бактэрыі, якія ўтрымліваюцца ў поласці рота, на гэты від цукру не рэагуюць».

Навінку навукоўцаў ужо ўкаранілі ў вытворчасць. Бельгійская кандытарская фабрыка выпускае цэлую серыю бяспечнага для дзіцячых зубоў шакаладу. Гэта прадукцыя атрымала ўхваленне міжнароднай арганізацыі Tooth Friendly International, і на ўпакоўцы новага шакаладу змяшчаецца лагатып арганізацыі «шчаслівы зубік». Але празмерна захапляцца гэтым ласункам не варта, папярэджваюць вытворцы. Бяспечны для зубной эмалі, па каларыйнасці ён не саступае традыцыйнаму шакаладу.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Пуховичского райисполкома проводит открытый аукцион

на право заключения договора аренды земельных участков на 50 лет в г. Марьина Горка:

№ лота	Адрес, площадь земельного участка (га), кадастровый номер	Начальная цена (рублей)	Расходы по документации (рублей)	Сельхоз потери (рублей)	Целевое назначение земельного участка	Наличие коммуникаций
1	ул.Сиреневая, пл. 0,2838, 624450100001002722	16 086 027	611 607	1 183 054	Строит-во оздор. комплекса с помещениями общепита и бытового обслуживания	в непосредственной близости сети электроснабжения, газоснабжения
2	ул. Сиреневая, пл. 0,2012, 624450100001002723	11 404 188	611 607	839 007	Строительство торгового центра	
3	ул. Калинина, пл. 0,0298, 624450100001002724	3 837 115	706 408		Размещение павильона по оказанию ритуальных услуг	сети электро-, водо-, газоснабжения

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата предмета аукциона должна быть произведена в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка. Договор аренды заключается в течение 2-х рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона, возмещения расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещения потерь сельскохозяйственного производства. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **13.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.01.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

18 декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5

проводит повторный аукцион по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для их обслуживания

На аукционные торги выставляются:

Наименование недвижимого имущества	Характеристика недвижимого имущества	Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка для участия в аукционе, рублей	Продавец недвижимого имущества
Лот 1. Административное здание (инв. № 610/С-96), расположенное в г. Борисове Минской области, ул. Минская, 21	Здание одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, частично обложенные кирпичом, перегородки дощатые оштукатурен

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

5

СНЕЖНЯ
2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 48 (15552)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Колькасць платных месцаў у дзяржаўных ВНУ будзе аптымізаваная

Паводле заключэння Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, прыёмная кампанія 2008 года прайшла найбольш арганізавана, у спакойнай рабочай абстаноўцы і добразычлівай атмасферы. Укараненне цэнтралізаванага тэсціравання, адкрытасць і даступнасць інфармацыі аб конкурсе і прахадным бале стварылі ўсе ўмовы для свабоднага свядомага выбару абітурыентамі ўстаноў адукацыі, будучай спецыяльнасці і формы атрымання адукацыі. Аб гэтым на калегіі свайго ведамства паведаміў намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Скарачэнне тэрмінаў падачы дакументаў, а значыць і ўсёй прыёмнай кампаніі на тыдзень, дазволілі навучальным установам у больш спакойным рэжыме падрыхтавацца да пачатку навучальнага года. Зняцце абмежаванняў пры паступленні на завочную форму атрымання адукацыі для дзяцей-інвалідаў і інвалідаў I і II груп дазволіла людзям з абмежаванымі магчымасцямі выбіраць найбольш зручную для іх форму навучання. Такім чынам сёлета на завочную форму навучання было залічана інвалідаў амаль удвая больш у параўнанні з папярэднім годам — 96 чалавек (летась — 50). А змяненне ўмоў мэтавага прыёму на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю дазволіла павялічыць прыём «мэтавікоў» на 8 працэнтаў і цалкам выканаць план мэтавага набору.

У параўнанні з папярэднім годам амаль удвая зменшылася колькасць абітурыентаў, якія былі залічаны па-за конкурсам на дзённую форму навучання.

Яшчэ адно новаўвядзенне прыёмнай кампаніі 2008 года — упарадкаванне льгот пры паступленні за кошт скарачэння катэгорый абітурыентаў, якія маюць права на пазаконкурснае залічэнне. Нагадаем, што яно захавалася толькі для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, пераможцаў спартыўных спаборніцтваў высокага рангу пры паступленні на спецыяльнасці фізічнай культуры і спорту, а таксама для ваеннаслужачых, якія маюць рэкамендацыі вайсковых часцей і паступаюць у ВНУ сілавых ведамстваў. Астатнія ж абітурыенты, якім раней прадастаўлялася льгота, карысталіся толькі правам пераважнага залічэння пры роўнай колькасці балаў. У выніку ў параўнанні з 2007 годам амаль удвая зменшылася колькасць абітурыентаў, залічаных па-за конкурсам на дзённую форму навучання: усяго 488 чалавек, з якіх 438 — гэта дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі.

Адной з адметнасцяў прыёмных кампаній апошніх гадоў стала зніжэнне ў ВНУ конкурсаў на бюджэтныя месцы дзённай формы навучання з 3 чалавек на месца ў 2004 годзе да 2,1 чалавека — у 2008 годзе.

— Гэта абумоўлена, на наш погляд, як змяншэннем колькасці абітурыентаў, так і тым фактарам, што ў рэжыме адкрытасці інфармацыі, якая абнаўляецца кожныя тры гадзіны, абітурыенты могуць пралічыць свае шанцы на паступленне. Увогуле на тых спецыяльнасцях, дзе залічэнне адбываецца толькі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання (а сёлета 75 працэнтаў першакурснікаў сталі студэнтамі па выніках ЦТ), такі паказчык, як сярэдні конкурс страчвае сваю актуальнасць. Асноўнае значэнне падчас уступнай кампаніі маюць набраныя абітурыентамі балы, з якіх фарміруецца прахадны бал. Між іншым, прахадныя балы выраслі па цэлым шэрагу запатрабаваных спецыяльнасцяў на 10-40 пазіцый.

Так, напрыклад, у БДУ на факультэце прыкладной матэматыкі (спецыяльнасці «прыкладная матэматыка», «эканамічная кібернетыка») прахадны бал склаў 314 пры конкурсе 1,7 чалавека на месца (летась 271 бал пры конкурсе 1 прэтэндэнт на месца). У БДУІР на спецыяльнасці «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 330 балаў пры конкурсе 2,3 чалавека на месца, на спецыяльнасці «інфарматыка» — 340 пры конкурсе 1,7 чалавека на месца. У Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце на спецыяльнасці «распрацоўка і эксплуатацыя нафтавых радовішчаў» — 273 балы, у БНТУ на спецыяльнасці «энергаэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент» — 307 балаў.

Па словах Аляксандра Жука, тры апошнія гады ў дзяржаўных ВНУ практычна незменнымі застаюцца суадносіны прыёму на бюджэтную і платную формы навучання (53-54 працэнты — «бюджэт» і 46-47 працэнтаў — платнае навучанне). Разам з тым паказчыкі прыёму на эканамічныя і юрыдычныя спецыяльнасці на ўмовах аплаты ў некаторых ВНУ проста «зашкальваюць».

— Відавочна, што папулярнасць гэтых спецыяльнасцяў сярод моладзі высокая, таму сфарміраваць групы на платнай аснове можна без праблем, аднак ва ўсім трэба ведаць меру, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Прывязу толькі некалькі прыкладаў залічэння на першы курс на спецыяльнасць «праваўстаўства»: у Віцебскім дзяржаўным універсітэце на завочную форму навучання залічана 20 чалавек на бюджэт і 207 — на ўмовах аплаты, на дзённую форму 10 чалавек за кошт бюджэту і 82 — на ўмовах аплаты; у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце (завочная форма) за кошт бюджэту — 0 чалавек і 211 — на ўмовах аплаты; у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце — 10 чалавек на бюджэт і 150 — на ўмовах аплаты. Суадносіны 1 да 15. Якім чынам пры такой колькасці студэнтаў можна забяспечыць якасць іх падрыхтоўкі, калі не хапае выкладчыкаў са ступенямі і званнямі? Увогуле неразборлівасць у прыёме абітурыентаў можа абярнуцца ў далейшым сур'ёзнымі наступствамі. Нельга трымацца любой цаной за абітурыента-«платніка». Зарабляць трэба і іншымі спосабамі, перш за ўсё шляхам павышэння эфектыўнасці навуковай і інавацыйнай дзейнасці. Пры зацвярджэнні плана прыёму на ўмовах аплаты кіраўнікі ВНУ павінны ўлічваць усе аспекты і наступствы колькаснага набору. Цяпер Міністэрствам адукацыі праводзіцца аналіз узроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, якія навучаюцца ў ВНУ на платнай аснове, па выніках якога з улікам патрэбы дзяржавы ў тых ці іншых спецыялістах будзе прынята рашэнне аб аптымізацыі колькасці платных месцаў у некаторых ВНУ па некаторых спецыяльнасцях.

Не менш адказна трэба падыходзіць і да планавання набору студэнтаў на бюджэт. У гэтым годзе ў дзяржаўных ВНУ засталіся незапоўненыя каля 400 бюджэтных месцаў, з іх 83 — на дзённай і 318 — на завочнай форме навучання. Так, у БДПУ імя М. Танка засталіся незапоўненыя 25 бюджэтных месцаў, з якіх 14 — па спецыяльнасці «гісторыя, геаграфія». У Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце — 15 бюджэтных месцаў, з якіх 12 — па спецыяльнасці «пачатковая адукацыя».

— Тлумачэнне недабору на завочную бюджэтную форму яшчэ можна знайсці: яно можа быць звязана з абмежаваннем прыёму асобаў, якія не працуюць па спецыяльнасці і не маюць адпаведнай прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі. А вось недабор на дзённую бюджэтную форму навучання тлумачыцца, напэўна, перш за ўсё тым, што ВНУ не праводзілі эфектыўную прафарыентацыйную работу з будучымі абітурыентамі.

Прахадныя балы выраслі па цэлым шэрагу запатрабаваных спецыяльнасцяў на 10-40 пазіцый

Трывожны званочак атрымалі ад намесніка міністра адукацыі кіраўнікі прыватных ВНУ, якія, відаць па ўсім, не зрабілі высноў па прыёме абітурыентаў на завочную форму навучання, хоць гэта пытанне ўжо ўзнімалася на мінулагодняй калегіі. Калі ў дзяржаўных ВНУ прыйшлі да прымальных суадносінаў набору на дзённую і завочную формы навучання (40 працэнтаў — завочная і 60 працэнтаў — дзённая), то ў прыватных ВНУ гэтыя суадносіны працягваюць расці ў бок завочнага навучання: у 2006 годзе — 63 працэнты, у 2007 годзе — 69 і ў 2008 годзе — 72 працэнты ад агульнай колькасці студэнтаў.

— Майце на ўвазе, што ў наступным годзе гэта пытанне будзе ўзята пад жорсткі кантроль з боку Міністэрства адукацыі. Адпаведныя даручэнні па праверцы ўзроўню і якасці падрыхтоўкі студэнтаў дадзены Дэпартаменту кантролю якасці адукацыі, — заявіў Аляксандр Жук.

Спыніўшыся на цэнтралізаваным тэсціраванні, Аляксандр Жук паведаміў, што ў мэтах павышэння інфармацыйнай бяспекі ў пастанову Савета Міністраў аб арганізацыі і правядзенні ЦТ будуць унесены пэўныя дапаўненні, у прыватнасці, забарона на наяўнасць у рабочых аўдыторыях не толькі ў абітурыентаў, але і ў арганізатараў тэсціравання мабільных тэлефонаў, іншых сродкаў перадачы звестак, а таксама ручак з чорнымі чарнілами.

Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў падзяліўся цікавымі назіраннямі. У інстытуце аналізавалі вынікі тэсціравання і прыйшлі да высновы, што пры спрашчэнні тэстаў працэнт абітурыентаў, якія з імі не спраўляюцца, застаецца прыкладна аднолькавым, затое павялічваецца колькасць высокіх вынікаў. Самыя горшыя вынікі абітурыенты дэманструюць на ЦТ па фізіцы і матэматыцы. Увогуле ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў працягвае зніжацца. Заўважана, што ўжо праз год пасля заканчэння школы пры паўтарэнні спробы паступлення абітурыенты дэманструюць горшыя вынікі — узровень іх ведаў рэзка падае. Аднак абітурыенты, якія закончылі школу да 1996 года, дэманструюць больш стабільныя веды. Арганізатары ЦТ таксама пацікавіліся, а якія ж памылкі дапусцілі ўдзельнікі ЦТ па фізіцы, якія атрымалі больш як 90 балаў — гэта проста блішучы вынік. Высветлілася, што яны дапускалі памылкі ў тэкставых задачах, напэўна таму, што проста не разумеюць, або чым у іх пытаюцца. На жаль, але лінгвістычныя кампетэнцыі сучаснай моладзі не вытрымліваюць ніякай крытыкі. Мова інтэрнэту — галоўная мова для многіх з іх.

І яшчэ некалькі цікавых фактаў былі агучаны на калегіі. Так, у прыватнасці, **у Міністэрстве адукацыі з задавальненнем канстатуюць рост цікаўнасці з боку абітурыентаў да атрымання другой ці трэцяй вышэйшай адукацыі: сёлета ахвотнікаў набралася больш як 2 тысячы чалавек. Вельмі высокім застаецца і попыт на завочную форму навучання ў дзяржаўных сярэдніх спецыяльных навучальных установах, дзе конкурсы на бюджэтныя месцы значна перавышаюць конкурсы на дзённым аддзяленні: сёлета сярэдні конкурс на завочнай форме навучання склаў 3,9 чалавека на месца.**

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Прымерка» да будучага месца вучобы

У дні зімовых і вясновых школьных канікулаў у Белдзяржуніверсітэце пройдуць Дні адчыненых дзвярэй для будучых абітурыентаў.

27 снежня маладых людзей чакаюць на гістарычным факультэце, 29 снежня — на факультэце філасофіі і сацыяльных навук, фізічным факультэце і ў Інстытуце бізнэсу і менеджменту тэхналогій. 30 снежня — у Інстытуце тэалогіі, Ліцэі БДУ і на біялагічным факультэце.

Пасля навагодніх святаў сустрэчы з абітурыентамі адновяцца: 5 студзеня Дзень адчыненых дзвярэй пройдзе на гуманітарным, геаграфічным, філалагічным, хімічным, эканамічным, юрыдычным факультэтах, факультэце міжнародных адносінаў, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і ў Інстытуце журналістыкі.

6 студзеня абітурыентаў будуць рады бачыць на факультэтах радыёфізікі і электронікі, у Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій, Інстытуце неперарыўнай адукацыі і Юрыдычным каледжы. На механіка-матэматычным факультэце рыхтуюцца сустрэць гасцей 9 студзеня. А на ваенным факультэце зімовы «прызыў» абітурыентаў прайшоў у лістападзе, праўда, у маладых людзей яшчэ будзе магчымасць завітаць на ваенны факультэт — наступны Дзень адчыненых дзвярэй пройдзе тут 3 красавіка. Увогуле на вясновых канікулах Дні адчыненых дзвярэй будуць праходзіць у Белдзяржуніверсітэце з 26 сакавіка па 4 красавіка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Нітка да ніткі. З дзённіка звычайнага студэнта

АКСІЁМА: перакусіць... і паесці зноў

Вам калі-небудзь даводзілася бываць у студэнцкай сталоўцы ў час пік? Поўнасцю з вамі згодзен, лепш гэтага не бачыць. Дзясяткі раз'юшаных хлапцоў і дзяўчат штурмуюць буфет у жаданні паспець паесці, бо да заканчэння перапынку можна і не ўправіцца адстаяць чаргу за апетытнай булачкай...

«Два салацікі, смажанку і фанту», «Піражок за 730, каву чорную і ірыску», «Сасіску ў цесце і сырок». Такімі вось не вельмі сытнымі, але даволі хуткімі рэчамі студэнты стараюцца замарыць свайго студэнцкага «чарвячка». Не тое, каб замарыць, а «замачыць», калі ўжыць дысфінізм. Толькі вось усё дарма: колькі не «мачы» — чарвячок жа жывучы!

Кожны сяроднестатыстычны студэнт ведае, што даперакусваць можна і да гастрыту, але сухія перакусванні ва ўсе студэнцкія часы застаюцца папулярнымі. У чым сакрэт?

А ўсё проста. Калі часу бракуе, а есці хочацца, то глядзіш не на якасць гэтай булачкі, а на кошт і знешні выгляд. Галоўнае, не дайсці да фінішу, калі булачкі — гэта асноўны прадукт і на сняданак, і на абед, і на вячэру... Тады ў студэнцкі арганізм стукаецца дысфункцыя страўніка. Каб яна не прыйшла да вас, пастарайцеся да свайго рацыёну падысці з адказнасцю і зрабіць «перакусы» як мінімум рэгулярнымі.

Не сакрэт, што большую частку сваіх старанна зароблены грошай студэнты спускаюць на ежу. Вось я, скажам, працэнтаў 70 ад сваёй стыпендыі «праядаю». Хоць мяне і супакойваюць (маўляў, у студэнцкія часы ўсе былі такімі), але мае пакупкі вучоныя назвалі б звычайнай шопаманіяй.

А пачынаецца ўсё звычайна з таго, што мне проста хочацца чагосьці смачненькага. Як у казцы, ногі самі крочаць да будыніны з вялікім надпісам «Прадуктовы магазін»...

ДА ВЫХАДУ З МАГАЗІНА ТРЫЦЦАЦЬ ХВІЛІН

Узяўшы кошык, стаіш як казачны багатыр на раздарожжы: налева пойдзеш — малако купіш, пойдзеш направа — набудзеш цукеркі, а пойдзеш прама — не мінаваць спакусы перад каўбасамі. Вось і ходзіш, як хадзіла па лесе Чырвоны Капялюшык з кошыкам: я і тое вазьму, я і гэта паспрабую...

Нават тэндэнцыя пайшла: сёння цябе на рыбнае цягне, а пазаўчора малочны дзень быў. Самае страшнае для кашалька — калі гэтыя дні змешаныя: хочацца адразу ўсяго і шмат.

«Ух ты, бублікі! Якія мяккія, свежыя; цёплыя яшчэ. Вазьму два. Не, лепш тры, каб на заўтра хапіла. Ой, а тут яшчэ і лаваш ёсць. Які б узяць: салёны за 2 тысячы ці салодкі за 1,5?..» Між іншым, глядзіш вось так на прадукты і разумееш: што ў вёсцы завуць кумпяком і паляндвіцай, тое гараджане называюць шынкай і прадаюць у магазінах за вялікія грошы; шырокі і тонкі блін, які ў вёсцы можа спячы любая гаспадыня, у горадзе гэта завецца лавашом і таксама прадаецца ў магазінах...

А яшчэ гарадскія магазіны гандлююць часам і зялёнай бульбай — ківі, якой у вёсцы напэўна б толькі падзівіліся. Тое і ж з малаком: тыя лішкі, якія вяскоўцы здаюць на малаказавод, у горадзе пад рознай тлустасцю, у розных упакоўках і па розных коштах спрабуюць сплавіць спажыўцу. А кісляк, вядомы кожнаму вяскоўцу з дзяцінства, абзываюць кефірам...

ДА ВЫХАДУ З МАГАЗІНА ДВАЦЦАЦЬ ХВІЛІН

Пакуль задумваўся над такімі глабальнымі пытаннямі, уласная рука нацягала розных прадуктаў ужо палову кошыка! Чаго тут толькі няма: і белы хлеб, і чорны, і лаваш, і малако, і марская капуста, і крабавыя палачкі, і два лімоны, і нават... мюслі.

У пошуках чаго-небудзь салодзенькага даходжу нарэшце да кандытарскага аддзела. І тут толькі вочы лаві: разбягаюцца, толькі пільнаваць паспявай.

«Гэта пячэнне сметанковае, а гэта ананасавае. Што ж узяць? Але што думаць: пакаштую і тое, і тое. А каб ведаць дакладна, вазьму яшчэ і фісташкавае». Паклаўшы пячэнне ў карзіну, спыняю свой позірк на напітках.

«Не бяры іх! Лепш дома гарбату з цукрам пап'еш», — гэта прачынаецца свядомасць. «Так, але ж куплена ўжо пячэнне. Вазьму вось гэты квас і ўсё, цягам месяца нічога больш купляць з каляровай вады не буду. Абяцаю», — адказвае сумленню голас страўніка. У выніку, патанцаваўшы яшчэ хвілін пяць у нерашучасці перад вітрынай з напіткамі, я вырашыў усё ж такі што-небудзь узяць. Але што іменна — квас ці мінералку?..

ДА ВЫХАДУ З МАГАЗІНА ДЗЕСЯЦЬ ХВІЛІН

Усведамленне таго, што прадукты ўжо выбраныя і нядрэнна было б ужо зварочваць да касы, раптам перабіваецца неверагодна прыемным водарам з аддзела тартоў і пірожных...

Часам, калі я ўяўляю сябе кандытарам, то заўсёды здзіўляюся: гэта ж якую сілу волі трэба мець, каб працуючы там, нічога не з'есці? Усё такое апетытнае і на цябе глядзіць. Любата! Эх, што ж гэта я шкадую заўсёды. Хоць раз пакаштаваць, ці змяніўся смак заварных пірожаных, якія так любіць мая мама? А вунь жа і фірменныя віточкі з крэмам, якія пячэ баба Гэлька, суседка маёй бабулі. Ну як тут стрымацца і не пакаштаваць?

ДА ВЫХАДУ З МАГАЗІНА ПЯЦЬ ХВІЛІН

Падыходжу да вітрыны, а там — яна. Тоўсценькая, кругленькая, гладзенькая. Ляжыць. І як наўмысна — быццам мяне чакае. Каўбаса «Малочная любіцельская». На прадаўгаватай качалачцы кошт — 12 210 рублёў. «Вось вазьму палову палачкі, мне і хопіць. І заплачу якіх тысяч шэсць».

Прадавец узвешвае палову «Любіцельскай» і наклейвае на яе кошт. Дзесяць тысяч. Палова палкі «малочнай» каштавала 10 380! Вось да чаго прыводзіць любоў з першага погляду...

У дарозе да касы натыкаюся на вітрыну з усякімі нікому не патрэбнымі шакаладнымі батончыкамі і жвачкамі. Ой, «Frutella», сунічная. Яе ж яшчэ з дзяцінства, памятаю, у рэкламах паказвалі. Пакаштаваць бы!

Ой, а каштуе гэта «радасць» зусім не па-дзіцячы... Але што на дробязі разменьвацца, вазьму — хоць раз на тыдзень будзе для мяне свята! Вы тут яшчэ і «Снікерс»...

ДА ВЫХАДУ АДНА ХВІЛІНА

Расплачваючыся на касе, падумаў, што затарваўся як на вайну. І навошта мне столькі?

Разумею, каўбасу трэба было браць вэнджаную ўсё ж такі. Але акрамя прадуктаў я набраў яшчэ і рознай непатрэбшчыны: сурвэтак, аднаразовых відэльцаў (!). І ўсё праз думкі тыпу: «А раптам спатрэбіцца?»

Прадавец агучвае суму — і я ледзьве не падаю ніцма: на сорак тысяч набраў. Во, даў! Прыкра тое, што ўжо сёння я ведаю: праз дні два я вярнуся і зноў буду стаяць на раздарожжы з кошыкам у руках. А пачнецца ўсё з таго, што мне проста захочацца чагосьці смачненькага. Устаноўка: бліжэйшыя дні не браць з сабой кашалёк!

* * *

Часам так хочацца адчуць сябе дзе-небудзь на моры, з тэмпературай паветра за 30 °С. Цёплае сонца прыпякае плечы, ласкавы ветрык прыемна казыча ў носе, чайкі нейкія над вадой крычаць і гарачы пясок пад нагамі. Шведскі стол і розныя прысмакі на ім. І чырвоныя спелыя трускаўкі ў смятане. І любая дзяўчына побач... Рамантыка.

Але да рэальнасці вяртае варона, што седзячы на голым дрэве, нешта крычыць другой, якая знайшла ў сметніцы скарынку хлеба.

Халодны сіверны вецер дзьме так моцна, што без шаліка і пальчатак — ні нагой.

Ідзеш у магазін. А трускалкі там — 33 тысячы за кілаграм(!). Уздыхаеш. І рука сама цягнецца... за булачкай.

Ілья ЛАПАТО.

У Новы год з Добрым Сэрцам

Навагоднія святы — самыя чаканыя ў маленькіх беларусаў. Кожны з іх ужо вызначыўся з тым, што хацеў бы знайсці пад навагодняй ёлкай. Але, на жаль, ёсць дзеткі, якія абдзелены сямейнай цеплынёй і вымушаны сустракаць гэта самае незвычайнае свята ў сацыяльных установах: дзіцячых дамах, інтэрнатах. Падарыць такім дзецям свята закліканая дабрачынная акцыя маладзёжнага валанцёрскага руху БРСМ «Добрае сэрца» — «У Новы год з Добрым Сэрцам».

Яна стартавала ў нашай краіне 1 снежня, а завершыцца 10 студзеня. Як адзначаюць арганізатары, валанцёры БРСМ вырашылі зрабіць як мага больш добрага і светлага для выхаванцаў дзіцячых інтэрнатных устаноў, сагрэўшы цеплынёй сваіх сэрцаў дзяцей-сірот. На гэтым тыдні ў рамках акцыі ўдзельнікі валанцёрскага руху «Добрае сэрца», прадстаўнікі галіновых камітэтаў БРСМ, пярвічных арганізацый рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання і прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі нашай краіны, якія адгукнуліся на валанцёрскі навагодні заклік, наведалі дапаможную школу-інтэрнат № 7 для дзяцей-сірот.

Госці перадалі выхаванцам цацкі, дзіцячыя кнігі, канцтавары, спартыўны інвентар. А па ініцыятыве пярвічнай арганізацыі БРСМ Міністэрства фінансаў на рахунак школы-інтэрната будзе пералічана грашовая дапамога. Дарэчы, трэба сказаць, што пярвічныя арганізацыі БРСМ рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання на працягу некалькіх гадоў аказваюць шэфскую дапамогу выхаванцам гэтай школы-інтэрната. Яны наведваюць дзетак падчас правядзення маладзёжным саюзам дабрачынных акцый да Дня ведаў, Раждаства, Новага года, Дня абароны дзяцей. Дзяўчынкі і хлопчыкі ўжо атрымлівалі ад актывістаў школьныя прылады, кнігі, мяккія цацкі, відэатэку з мультыплікацыйных і мастацкіх фільмаў для дзяцей, музычны цэнтр, DVD-плэер і DVD-дыскі з запісамі фільмаў, лічбавы фотаапарат, велатрэнажор, спартыўны інвентар. Дадам: на сёння ў дапаможнай школе-інтэрнаце № 7 навучаюцца і жывуць дзеці ва ўзросце ад 7 да 17 гадоў з інтэлектуальнай недастатковасцю ў развіцці. У асноўным гэта дзеці-сіроты і дзеці, пакінутыя без апекі бацькоў. У рамках акцыі «У Новы год з Добрым Сэрцам» актывісты маладзёжнага саюза наведаюць не адну такую сацыяльную ўстанову і падораць дзецям радасць і пяшчоту сваіх сэрцаў.

Падарыць дзецям свята не так і складана. Галоўнае, як кажуць, жаданне. Новы год — гэта свята, якога заўсёды чакаюць маленькія беларусы. Зрабіць гэты дзень незвычайным і запамінальным па сілах дарослым. І галоўнае тут не ў кошце падарунка, а ў той атмасферы цеплыні і любові, якая пануе падчас наведвання дзіцячых дамоў і сацыяльных прытулкаў.

Святлана СУХАРКО.

Наш фармат

«Зоркі» на сувязі

На сайце Мінскага абласнога камітэта БРСМ www.brsmOK.by 3 снежня стартаваў новы праект — інтэрнэт-канферэнцыя «Размова он-лайн».

Ідэю гэту прапанавала кіраўніцтву абкама кіраўнік прэс-цэнтра «Моладзь Міншчыны» Аксана Козінава: «Мэта праекта — даць магчымасць маладым людзям з усёй вобласці бліжэй пазнаёміцца з папулярнымі людзьмі, з якіх варта браць прыклад. Мы выбіраем гучныя імёны — вядомых спартсменаў, артыстаў, тых, хто сапраўды з'яўляецца кумірамі моладзі». Напрыклад, першымі гасцямі інтэрнэт-канферэнцыі сталі выканаўцы Аня Шаркунова і Георгій Калдун, наступным героем абраны Аляксей Хлястоў, у перспектыве — сустрэча з Дзмітрыем Дашчынскім, Русланам Салеем, Міхаілам Грабоўскім...

Ужо самы першы «блін» атрымаўся ўдалым. За два тыдні, пачынаючы з 19 лістапада, наведвальнікі сайта задалі гасцям больш як 550 пытанняў! Адміністратары адабралі толькі самыя цікавыя з іх, і ўсё роўна лік пераваліў за паўсотні. Яшчэ частку пытанняў ахвотныя агучылі па тэлефоне падчас «гарачай лініі». Госці ж, са свайго боку, адзначылі аўтараў двух найбольш удалых пытанняў — персанальнымі падарункамі. Дый самі ад душы пасмяяліся, расказваючы, што паміж імі насамрэч — «раманчык або Германчык», якія мары ў іхнім жыцці спраўдзіліся, чым, акрамя спеваў, яны займаюцца, як ставяцца да крытыкі...

Падобныя размовы-канферэнцыі Мінскі абласны абкам БРСМ плануе праводзіць раз на месяц.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Аляксандр СЦЯШЭНКА:

«МАГУ ЛЮБУЮ ДЗЯЎЧЫНУ НАВУЧЫЦЬ, ЯК СКІДВАЦЬ ВАГУ»

Дваццацідвухгадовы беларус стаў чэмпіёнам Еўропы па дзюдо

На чэмпіянаце Еўропы сярод моладзі (да 23 гадоў), які праходзіў у харвацкім Загрэбе, мінчанін Аляксандр Сцяшэнка заваяваў залаты медаль. Мой тэлефонны званок застаў Аляксандра на працэдурах: «Я зараз у дыягнастычным цэнтры. А вось потым буду свабодны для размовы».

Прызнацца, пры сустрэчы я крыху перапужаўся. Ваяўнічы сіняк пад вокам рабіў з беларускага дзюдаіста нейкага злога, я сказаў бы, адмоўнага персанажа з фільмаў пра баі без правілаў. Аднак размова з першых жа хвілін супакоіла, а Аляксандр аказаўся прыемным, добразычлівым суразмоўцам.

— Нічога страшнага, звычайны, планавы агляд, — адразу супакоіў суразмоўца. — Мы двойчы на год ходзім у дыягнастычны цэнтр да дактароў. Спартсмен заўсёды павінен быць здаровым.

— А «фінгал» пад вокам адкуль?

— А, гэта якраз у фінальным паядынку няўдала сутыкнуўся са сваім супернікам. Такія пашкоджанні нетыповыя для дзюдо. Сінякі і рассячэнні здараюцца выпадкова і вельмі рэдка.

— Якой здалася табе гэта перамога?

— Цяжкасць была толькі адна — не паспеў добра падрыхтавацца. Перад турнірам у нас быў збор у «Стайках». Напярэдадні тыдзень прахварэў бранхітам, а падчас трэніровак «падхапіў» прастуду, і зноў не мог паўнавартасна трэніравацца. А на чэмпіянаце папалася зручная падгрупа, таму да фіналу дайшоў без вялікіх праблем. А ў апошняй схватцы сустрэў якаснае супраціўленне, ды і стала адбівацца нядаўняя хвароба, антыбіётыкі. Аднак усё скончылася добра.

— На мінулагоднім першынстве ў Аўстрыі ты заваяваў «бронзу» ў вагавой катэгорыі да 73 кг, а цяпер перамог у катэгорыі менш за 81 кг. Што стала прычынай такога пераходу?

— Выступаў у больш «лёгкай» вагавой катэгорыі, таму што была надзея паехаць на Алімпіяду ў Пекіне. А потым, калі ў алімпійскую каманду не трапіў, расслабіўся і дайшоў да сваёй вагі. Да наступнай Алімпіяды яшчэ чатыры гады чакаць, таму і «зганяць» вагу такі працяжны тэрмін няма сэнсу. Лепей пакрысе асвойваць катэгорыю да 81 кг.

— Атрымліваецца, што гэта твая катэгорыя?

— Мая вага каля 79 кг. Таму зручней працаваць менавіта ў гэтай катэгорыі і ні ў чым сабе не адмаўляць. А так прыходзіцца харчавацца па спецыяльнай дыеце, трэніравацца ў спецыяльных касцюмах...

— І ты зараз зможаш любой дзяўчыне даць прафесійную параду, як скінуць вагу за кароткі тэрмін...

— Можна 4-5 кг «скінуць» і за два дні, аднак пасля гэтага будзеш сябе не вельмі добра адчуваць. Лепей рабіць гэта павольна, тыдні за два. «Сушыць» арганізм, піць меней вады, есці меней хлеба. Трэба дадаць, што ўсё залежыць ад індывідуальных асаблівасцяў арганізма, таму і агульнага рэцэпта для ўсіх не існуе.

— Чым займаюцца чэмпіёны пасля ўдалага турніру?

— Звычайны графік. Буду хадзіць на трэніроўкі, падтрымліваць форму, можа стану развучваць новыя рухі ці прыёмы.

— Наконт таго, каб схадзіць на начную дыскатэку, і размовы няма?

— Чаму, схадзіць можна. Проста я ж цяпер чалавек сямейны, таму і сэнсу вялікага няма.

(Трэба сказаць, што незадоўга да «залатога» турніру Аляксандр Сцяшэнка ажаніўся з чэмпіёнкай свету сярод моладзі па самба Юліяй Отчанашкай. Можа, і гэта адна з прычын удалага выступлення?)

Раней, класе ў 11-м, з сябрамі часта выбіраліся на дыскатэкі. А цяпер з узростам сілаў усё меней і меней...

— А пашпарт у вас у 11-м класе пры ўваходзе на дыскатэку не прасілі паказаць?

— Раней жа не так цяжка з гэтым было — прапускалі амаль усіх без разбору. Гэта цяпер строгі фэйс-кантроль.

— А чым яшчэ бавіш вольны час?

— Не так яго многа бывае, вольнага часу. Я ж яшчэ вучуся завочна ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Зараз на другім курсе, пасля заканчэння атрымаю спецыяльнасць юрыста, гаспадарчае права. Калі, вядома ж, атрымаецца закончыць.

— Падабаецца вучыцца?

— У мяне тата — юрыст, атрымліваецца, па яго слядах іду. Пасля заканчэння вучылішча алімпійскага рэзерву быў выбар — ісці далей па фізкультурнай спецыялізацыі ці паступаць у грамадзянскую ВНУ. Перспектыва восем гадоў (два ў вучылішчы ды 6 ва ўніверсітэце) вучыцца на трэнера не прывабіла, таму і вырашыў пайсці на юрыста.

— Ажаніўшыся са спартсменкай, ты закрыў адразу два пытанні. Можна разам на турніры ездзіць, ды і не кожная парадуецца, калі муж па тры тыдні будзе ездзіць па розных зборах і чэмпіянатах...

— Не такая гэта ўжо і праблема. Калі зборы ў «Стайках», напрыклад, то не так цяжка прыехаць у Мінск і сустрэцца з дзяўчынай. Нават калі яна і далёкая ад спорту. Але я з Юляй знаёмы ўжо 3,5 года, таму і рашэнне нельга назваць паспешлівым.

— Са «Стаек» да Юлі на машыне ездзіш?

— Не, машыны ў мяне няма. Дарэчы, і вадзіцельскае пасведчанне часу атрымаць не было. Таму, калі набудзем машыну, давядзецца Юлі быць маім асабістым вадзіцелем — у яе «правы» ёсць.

— Іншымі відамі спорту акрамя дзюдо цікавішся?

— Апошнім часам усе хворыя на футбол. Мне сам па сабе футбол не вельмі падабаецца, больш люблю глядзець небяспечныя моманты ды нарэзкі з матчаў. У матчы Лігі чэмпіёнаў БАТЭ супраць «Рэала» паглядзеў толькі першыя хвіліны, а потым расхваляваўся і ўвогуле выключыў тэлевізар.

Юрась ШАЎЦОЎ.
Фота з архіва Аляксандра СЦЯШЭНКІ.

Выпрабавана на сабе

КАХАННЕ ПА ПЕРСАНАЛЬНЫМ ГАРАСКОПЕ

Крызіс у адносінах з часам перажываюць многія пары. Мы з Кацяй не сталі таму выключэннем. Пасля працяглай ідыліі з'явілася нейкае непаразуменне, крыўды, нават сваркі.

— Дзіма, нешта не тое ў нас адбываецца, — сказала аднойчы Каця. — Трэба нешта рабіць, пакуль не позна.

— Ну, і што ж ты прапаноўваеш? — пытаюся я.

— Давай замовім сабе персанальны гараскоп для каханых, кажуць, што вельмі дапамагае, — выпаліла Каця.

Пакорпаўшыся ў Інтэрнэце, знайшлі аб'яву: «Персанальны прагноз дазволіць вам паспяхова планаваць сваё асабістае жыццё, выбіраць найболей удалы час для спатканняў, новых знаёмстваў і сэксу», — гаварылася ў ім.

Адзначылі неабходныя звесткі (імёны, дату, час і месца нараджэння і іншае, што патрабавалася), пацвердзілі заказ. У хуткім часе атрымалі паведамленне з просьбай зрабіць папярэднюю аплату ў памеры 10 долараў. Для жыхароў Беларусі гэта можна было зрабіць толькі праз электронны кашалёк.

Эксперымент пачаўся.

Дзень першы

Гарманічны аспект транзітнага Сатурна да транзітнага Месяца

«У гэты час у вас узрасце асабістае абаянне, гаварлівасць і прывабнасць. У любоўных адносінах вас чакае поўнае паразуменне і гармонія».

...Раніцай наступнага дня я прачнуўся позна. Душ, сняданак... «Сёння ж першы дзень, як мы вырашылі прытрымлівацца парад гараскопа!» — стукнула ў галаву.

Хуценька тэлефаную Каці.

— Прывітанне! — крычу ў трубку. — Як настрой? Давай сходзім сёння куды-небудзь!

— Давай... — сонным голасам адказвае Каця. — А куды?

— Давай у парк, пасядзім, пагутарым, — прапаноўваю я.

— У парк дык у парк, — сяброўка была згаворлівая, — там мы і на самай справе былі даўно. Так што нядрэнная ідэя.

Такой прагулкі ўжо не было даўно. Да таго ж надвор'е вельмі спрыяльна аднеслася да нас, нават сонца выглянула. За паўдня сумеснага адпачынку мы ні разу не пасварыліся, наадварот, здавалася, забыліся пра ўсе ранейшыя крыўды.

— Ты нейкі сёння асабліва абаяльны, — заўважыла Каця.

— Згодзен. І ты такая мілая, — усміхаюся ў адказ.

Цікава, прадказанні гараскопа цалкам супалі з нашым настроем. Гэта парадавала.

Дзень другі

Напружаны аспект транзітнага Нептуна да транзітнага Месяца

«Сёння вы адчуеце некаторы спад пачуццяў і захапленне ў любоўных адносінах. Вамі можа авалодаць няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Паўстануць сумненні ў шчырасці пачуццяў вашай каханай да вас».

«А чаму б нам не пайсці сёння ў тэатр?» — падумаў я чарговым ранкам. Доўга разважаць не стаў. Трэба было знайсці білеты. Аказалася, што зрабіць гэта не зусім і лёгка. На тое, што хацелася б паглядзець, білетаў ужо не было. Давялося папрасіць свайго знаёмага, які (як на тыя футбольныя матчы) утрая даражэй прадаў мне два білеты. Тэлефаную Каці.

— Дзіма, які тэатр? Ты ж ведаеш, што вечарам мне трэба быць на працы, — пачуў я ў адказ.

— Нешта не памятаю, каб ты мне казала, што сёння працуеш да пазна. У цябе ж выхадны дзень павінен быць!

— Павінен, але не будзе! І нагогул, як ты мог купіць білеты, не параіўшыся са мной?

Наша гутарка зайшла ў тупік. У выніку, мы зноў пасварыліся. Настрой быў сапсаваны ў абодвух. У тэатр я пайшоў са стрыечным братам, у якога якраз быў выхадны.

Дзень трэці

Злучэнне транзітнага Урана з транзітным Месяцам

«Побач са сваёй каханай вы адчуеце сябе самым шчаслівым на свеце. Непажадана ў гэты перыяд знаходзіцца дома ў адзіноце, таму што вы можаце ўпусціць шанц разнастаіць свае адносіны».

Наступны дзень я планаваў правесці ў ганарлівай адзіноце. Якраз і справы нейкія знайшліся. Да таго ж, ведаючы характар Каці, пасля сварак і разборак яе лепш не турбаваць хоць бы адзін дзень. Але, прачытаўшы гараскоп, вырашыў патэлефанаваць.

— Што з табой здарылася? Звычайна ты так хутка не тэлефануеш пасля сварак, — здзівілася Каця. — Можа, ударыўся аб нешта?

Я разумею, што Каця пачынае жартаваць, значыць, не ўсё так дрэнна. Можна ісці на прымірэнне.

— Я тут падумаў, можа, мы сёння сустрэнемся вечарам...

Увечары гэтага дня я быў самым шчаслівым хлопцам на свеце. Як і абяцаў гараскоп.

Чацвёрты дзень

Напружаны аспект транзітнага Урана да транзітнага Месяца

«У гэты дзень вы будзеце залішне імпульсіўным, неўраўнаважаным, можаце нарабіць памылак. Імкніцеся ў адносінах з каханай быць больш стрыманым, пастарайцеся запасціся цярпеннем».

Прызнацца, я не вельмі паверыў таму, што прадказваў гараскоп. У нашых адносінах зноў панавала гармонія. Усё ішло як належыць. Днём мы былі занятыя сваімі справамі, а вечарам планавалі пайсці ў тэатр. Бліжэй да абеду стала вядома, што мне прыйдзецца затрымацца. Ніякага тэатра сёння не будзе. Тэлефаную Каці.

— ... сёння мы не зможам пайсці ў тэатр, — пачынаю я.

Далей не трэба ўдавацца ў падрабязнасці і расказваць аб тым, як ішла гаворка. Скажу толькі адно: Каця западозрыла мяне ў здрадзе.

Пяты дзень

Злучэнне транзітнага Марса з транзітным Месяцам

«Вам захочацца здзівіць каханую, у характары выявіцца вынаходлівасць і арыгінальнасць. Удалы час для актыўнага адпачынку і незвычайных забаў».

Што-што, а вынаходлівасць і арыгінальнасць спатрэбіліся мне ў гэты дзень, дакладней вечар. Трэба было зноў неяк наладжваць адносіны. Да таго ж, я адчуваў сваю віну за ўчарашнюю сварку. Дапамаглі мая неўраўнаважанасць і імпульсіўнасць. Што ж мне такое прыдумаць, каб загладзіць сваю віну? Мая фантазія кудысьці сышла. Можа, пайсці сёння? Не арыгінальна, але хоць нейкае рашэнне. Тэлефаную Каці і запрашаю яе на спатканне. Яна трохі ўпіраецца, але потым згаджаецца.

Вечар прайшоў адносна спакойна.

Дзень шосты

На шосты дзень я проста забыўся паглядзець у гараскоп. Прыйшлося паступаць так, як падказвалі сэрца і розум. Прызнацца, яны мяне не падвялі. Хоць і гараскоп зрабіў сваю справу. Праўда, я так і не зразумеў, прычым да любоўных адносінаў Сатурн, Месяц, Юпітэр... Для мяне гэта засталося загадкай. Больш паслугамі астролагаў я не карыстаўся.

Кампетэнтна

Юлія КОХАВА, урач-псіхатэрапеўт: «Чалавецтва адчувае востры дэфіцыт упэўненасці ў заўтрашнім дні»

— Нягледзячы на тое, што навуковыя дасягненні істотна змянілі наша жыццё, многія дагэтуль вераць у прыметы і з асаблівай цікавасцю вывучаюць гараскопы. Спробы атрымання навуковых пацвярджэнняў таго, што гаворыцца ў гараскопах, у тым ліку і любоўных, пастаянна церпіць фіяска, але гэта ніяк не адбіваецца на папулярнасці астралагічных прадказанняў. Сёння чалавецтва адчувае востры дэфіцыт упэўненасці ў заўтрашнім дні. І для таго каб атрымаць хоць нейкую псіхалагічную падтрымку людзі звяртаюцца да выпрабаванага часам сродку, напрыклад, гараскопа. Навука дае адказы далёка не на ўсе пытанні, прычым даволі часта гэтыя адказы не такія прыемныя, як гэтага хацелася б. Астралогія гатова растлумачыць усё, а двухсэнсоўнасць прадказанняў толькі на руку тым, хто верыць у тое, у што хочацца верыць...

Дзмітрый БОБРЫК.

СТУДЭНТЫ БДУ — У ФІНАЛЕ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ

Каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — адзіная з беларускіх удзельнікаў паўфінальных спаборніцтваў, заваявала пуцёўку ў фінал студэнцкага чэмпіянату свету па праграмаванні. У паўфінальных спаборніцтвах сустрэліся больш як 200 камандаў з 10 краін свету.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЯКАЯ ЯНА, ВІЛЬНЯ?

Некаторыя, вяртаючыся з Літвы, кажуць, што нічога асаблівага ў ёй няма, а іншыя, наадварот, мараць вярнуцца туды, толькі перасекшы граніцу. Апошніх, зразумела, больш. І я, прызнацца, адна з іх. Вярнулася з пазітыўнымі эмоцыямі, натхненнем і вырашыла падзяліцца сваімі назіраннямі: якая яна, Вільня?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З таго часу як рэспублікі савецкай Прыбалтыкі рашуча звязалі свой далейшы лёс з аб'яднанай Еўропай, аддзяліўшыся ад нас цяжкім візавым бар'ерам, паездкі туды сталі не такімі частымі і, на жаль, факультатыўнымі. Але, шчыра кажучы, гэтай восенню, як я ўжо казала, мне вельмі пашанцавала і амаль без усялякіх праблем і доўгіх чэргаў каля пасольства я атрымала доўгачаканы штамп. Не, ніякіх «чорных» сувязяў у мяне няма, усё шмат лягчэй — я студэнтка аднаго літоўскага ўніверсітэта, вучуся на завочным аддзяленні і ехала на сесію. Таму, пры дапамозе кіраўнікоў ВНУ, даволі хутка і спакойна разабралася з усімі гэтымі папяровымі справамі і пайшла збіраць чамаданы. Напярэдзе падарожжа...

«ЖЫЛЛЁВЫЯ» ЎДАРЫ

Першае ўражанне, якое мы з сяброўкай адчулі, прыехаўшы ў Вільню, аказалася на дзіва вельмі прыемным — перад намі ляжаў утульны еўрапейскі горад, усе без выключэння жыхары якога з задавальненнем гаварылі на рускай мове, а цэны, у адрозненне ад парыжскіх, радавалі сваёй даступнасцю. Але гэта не адносілася да жылля... Па-першае, свабодны нумар у гасцініцы знайсці адразу амаль не ўдаецца нікому, па-другое — кошт за суткі вельмі вялікі. Зразумела, вы падумаеце, што для студэнта дорага ўсё, але нават мае сябры, якія ўжо даволі даўно жывуць у Вільні, кажуць: «Сапраўды, з таго часу, як Літва ўвайшла ў ЕС, цэны на жыллё сталі па-еўрапейску «звычайнымі», але для нас «непамернымі». Мала хто можа вось так проста аддаваць 300-400 еўра за звычайную кватэру ў месяц... Увогуле, цяжка з гэтым у нас». Вось і нам было цяжка! Хоць і падрыхтаваліся, але значна адчувалі гэтыя «жыллёвыя» ўдары па кішэні.

ВІЛЬНЯ: СТАРАЯ І НОВАЯ

Зразумела, абысціся без тэматычнай прагулкі было проста немагчыма. Разам з нашымі літоўскімі сябрамі мы сустрэліся прама на вакзале і адтуль ужо распачалі падарожжа. «Гуляць трэба, бясспрэчна, пешшу. Вільня — горад невялікі, без шырокіх праспектаў і бясконцых плошчаў, але з вузкімі вулачкамі, маленькімі трохвугольнымі скверамі і паркамі. Няспешная прагулка без усялякіх картаў і плана — лепшы спосаб зразумець мілую і хатнюю прыгажосць горада», — з веданнем справы распавядае Каця, мая добрая літоўская сяброўка, з якой мы пазнаёміліся гадоў пяць таму ў Мінску. З таго часу, на шчасце, сувязь не згубілі, і было вельмі прыемна, калі яна з радасцю вызвалася нам дапамагаць. Ды і сяброў узяла! Да слова, літоўцы даволі сяброўскія і адкрытыя людзі. Вось аднойчы, калі мы ехалі з аднаго вялізнага гандлёвага цэнтра, які знаходзіўся амаль за горадам, і заблудзілілі, нам без праблем дапамаглі: не толькі сказалі як ехаць, але яшчэ і невялічкую карту намалявалі, спыталі з якой мы краіны і пажадалі поспехаў!

Вяртаючыся да горада, хочацца адзначыць некранутую прыгажосць старых пабудоў, утульнасць шматлікіх кавярняў, арыгінальнае праектаванне вулачак. Менавіта такім я і марыла яго ўбачыць. Казачная Вільня, у якой кожны можа знайсці тое, што шукае.

Дзіўна, але калі параўноўваць Мінск і Вільню, то цяжка ўявіць, што некалі гэтыя гарады ўваходзілі ў склад адной дзяржавы. Усяго тры-чатыры гадзіны язды, а адрозненні неверагодныя. Ні ў якім разе я не хачу гэтым сказаць, што адзін горад горшы ці лепшы за другі, не... Хутчэй, не верыцца ў агульную гісторыю некалькі стагоддзяў таму. Усё рознае: людзі, традыцыі, інтарэсы, архітэктура... Адно шкада, што ў адрозненне ад Вільні, у Мінску ўжо не знойдзеш настолькі старажытных пабудоў, у якіх дата іх стварэння даўно пакрылася пылам.

МАЕ «ЎНІВЕРСІТЭТЫ»

Ледзь не забылася, для чаго я ў прынцыпе і прыехала. Вучыцца... Што ж, універсітэт сустрэў мяне даволі цёпла і, прызнацца, здзівіў. Усе вітаюцца нават не ведаючы адзін аднаго, ужо «сталыя» студэнты з задавальненнем дапамагаюць. Вакол амаль ніводнага студэнта без ноўтбука, але гэта і не дзіўна — на тэрыторыі ўсяго ўніверсітэта ёсць бясплатны бесправадны інтэрнэт! «Вось і ў нас бы так!» — уздыхае па зразумелай прычыне адзін з маіх сугрупнікаў. Сапраўды, вельмі еўрапейскі падыход да навучання: для студэнтаў ствараецца ўсё неабходнае! І гэта не толькі бясплатны інтэрнэт, гэта яшчэ і пастаянныя семінары з прадстаўнікамі розных універсітэтаў Еўропы, практыка за межамі Літвы, ролевыя гульні і сумесныя мерапрыемствы. Адно толькі не ўразіла — асартымент у сталоўцы... Хоць цэны і радавалі, але на трэці дзень сасісак ужо нікому не хацелася!

РЭЙД ПА МАГАЗІНАХ

А вось тут ужо было не да жартаў!!! Магазіны ўражвалі: цэны, колькасць, якасць... Што датычыцца літоўцаў, то ў вочы адразу кідалася, што апрануты яны добра і з густам. Гэта і не дзіўна! «Два разы на год у нас пачынаюцца распродажы, — інфармуе нас Каця, — і тады цэны зніжаюцца проста да мінімуму. І нават пры мінімальным бюджэце можна добра і прыгожа апрануцца, што ў прынцыпе і робяць жыхары Вільні. Мы не разумеем, як можна плаціць вялікія грошы за адзенне... Мы лепш з'ездзім у падарожжа ці яшчэ што-небудзь зробім». Але, нягледзячы ні на якія размовы, мы ўсе без выключэння шкадавалі, што не ўзялі чамадан памерам з машыну. Як мінімум... Бо галоўнае — не губляць самавалодання ад вялізнага выбару і цэнаў. Што датычыцца магазінаў, у якіх прадаюцца вядомыя на ўвесь свет фірмы адзення, то туды лепш не заходзіць — цэны будуць вышэйшыя нават за нашы.

АДПАЧЫНАК

У гэтым літоўцы даволі кансерватыўныя — любяць пасядзець у спакойнай кампаніі за кавай ці ўвогуле застацца дома. У адрозненне ад Мінска, у Вільні начнога жыцця амаль няма. Ці яно вельмі добра замаскіравана. У гадзін восем, калі становіцца цёмна, узровень актыўнасці на вуліцах такі ж, як у нас у гадзін дванаццаць. Вільня засынае... І на вуліцах можна сустрэць толькі турыстаў, якія з радасцю нешта вывучаюць і фатаграфуюць. І адна цэнтральная кавярня, якая працуе да дзвюх гадзін — менавіта там мы і спыняліся: спаць не хацелася, а горад вабіў!

Вільня... Яна сапраўды захавала таемнасць стагоддзяў і некранутую раскошу гісторыі. Яна ўпэўніла, што вярнуцца не проста можна, а жыццёва неабходна... Таму, да сустрэчы, Вільня!

Дзіяна АРЫПАВА.

Захапленні

СОКС. ГАЛОЎНАЕ — МЯЧЫК

Не раз мне даводзілася бачыць, як гурт падлеткаў забаўляецца з нейкім незвычайным мячыкам, перакідваючы яго адзін другому без дапамогі рук. Пры гэтым выкарыстоўваліся такія віртуозныя рухі цела, што падлеткам пазайздросціў бы сталы танцор ці нават акрабат. Я зацікавілася гэтай вясёлай гульнёй і вырашыла даведацца пра яе больш.

Сокс быў прыдуманы ў ЗША ў 70-я гады XX стагоддзя. Сама назва « SOCKS» перакладаецца з англійскай мовы як шкарпэткі, ці панчохі, таму што першапачаткова мячыкам для гульні служылі шкарпэткі, набітыя чымсьці сыпучым. Існуе некалькі напрамкаў гэтай гульні, напрыклад, калі мячык падае цераз сетку. А самы складаны і прыгожы накірунак — Fottbag Freestyle, дзе ўдзельнікі гульні прыдумваюць бясконцую колькасць новых рухаў.

Вось што расказвае пра сваё захапленне гэтай гульнёй соксар Дзмітрый Багдановіч:

— Пра сокс я даведаўся ад сяброў недзе 1,5 года таму. Гульня зацікавіла і спадабалася. Для яе не патрэбны дарагое абсталяванне і спецыяльныя памяшканні. Жаданне, добрае, без дажджу і снегу, надвор'е, некалькі сяброў, мячык — і гульня пачалася. Гэта не толькі цудоўны спосаб бавіць час, але і магчымасць навучыцца валодаць сваім целам, кардынаваць рухі.

Правілы соксу таксама нескладаныя. Колькасць удзельнікаў не абмежаваная, але іх не павінна быць менш за два. Яны становяцца ў круг, «чаканяць» мячык нагамі (наском нагі, пяткай ці каленкай) і перакідваюць яго іншаму. Правілы дазваляюць таксама прымаць мячык на грудзі. Але ні ў якім выпадку нельга дакранацца да яго рукамі! За гэта можна атрымаць штраф, прычым не з самых прыемных: кожны ўдзельнік дае віноватаму пінок. І нават калі мячык падае на асфальт, яго неабходна падымаць з дапамогай ног.

— Адзенне для гульні таксама мае значэнне, — працягвае Дзмітрый Багдановіч. — Самы добры абутак для соксу — кеды. Хоць падыходзіць усё, што не на высокіх абцасах і не перашкаджае рухам. Далей — шорты або штаны накшталт спартыўных, з той жа мэтай. Верх можа быць любым, але гуляць у доўгім паліто ці «дутай» куртцы, шчыра кажучы, не вельмі зручна. Лепшы варыянт — майка ці футболка.

Цікава, што самы першы мячык для соксу набівалі бабамі. Цяпер сокс робяць з самымі рознымі «начынкамі». Гэта, перш за ўсё, грэчка, сухі гарох, пластыкавыя каменьчыкі, нават рыс і іншыя крупы. Мячык для соксу можна зрабіць самому ці купіць. Ён, дарэчы, не вельмі дарагі, прыкладна ад 10 тысяч беларускіх рублёў. Мячык, калі ён якасны, праслужыць даволі доўга, калі не згубіцца ці не забудзецца дзесьці. Яшчэ адзін плюс гэтай гульні ў тым, што невялікіх памераў мячык заўсёды можна ўзяць з сабой і пачаць гуляць, як толькі з'явіцца жаданне і свабодная хвілінка.

Так што, калі вам стала гэтак жа цікава, запрашайце сяброў, выбірайце сокс любога колеру і з любой «начынкай» і пачынайце гульню. Асабіста я якраз гэтым і займуся, як толькі наладзіцца надвор'е.

Таццяна КАВАЛЁВА.

За кратамі

ЖЫЦЦЁ, ПУШЧАНАЕ ПАД АДХОН...

Калі жыццё робіць нечаканы віраж і, здаецца, страчана так многа — што дапаможа нам? Падтрымка блізкіх людзей? А калі іх няма? Застаецца толькі вера — у сябе, свае сілы, розум, дабрыню, сумленне, чалавечую годнасць...

У выхаваўчай калоніі для няпоўнагадовых № 2, што ў Бабруйску, такіх людзей, страціўшых час, мажлівасці, добрае імя — шмат. Кожны з іх верыць, што выйдзе адсюль, каб ніколі не вярнуцца за краты зноў. Але атрымліваецца, на жаль, далёка не ва ўсіх...

Журналісты пазнаёміліся з жыццём у калоніі, сустрэліся з тымі, хто там адбывае пакаранне. Ніжэй — рэпартаж аб гэтым...

ПРАЦАТЭРАПІЯ

На тэрыторыі калоніі нас суправаджае загадчык аддзела папраўчага працэсу ВК № 2 Алег Шункевіч. Пачынаем з агляду вучэбных карпусоў ПТВ, школы...

ЦЯПЕР У ВЫХАВАЎЧАЙ КАЛОНІІ № 2, ШТО Ў БАБРУЙСКУ, БОЛЬШ ЗА 400 АСУДЖАНЫХ. ДЛЯ НЯПОЎНАГАДОВЫХ У БЕЛАРУСІ ЁСЦЬ ЯШЧЭ ДЗВЕ КАЛОНІІ: У ВІЦЕБСКУ ДЛЯ ХЛОПЦАЎ І ЎЧАСТАК ЖАНОЧАЙ КАЛОНІІ Ў ГОМЕЛІ — ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ.

У вытворчай зоне працуюць хлопцы, якім споўнілася 16 гадоў. Шэсць гадзін у дзень. Карысці, праўду кажучы, ад іх нямнога, гэта, хутчэй, працатэрапія. Але калі ёсць заказы, асуджаныя робяць нескладаныя вырабы: драўляныя скрыні для прадуктаў, табурэткі, разбракоўваюць гуму... Некалькі гадоў таму, успамінае наш «гід», тут вытворчасць была больш актыўнай: хлопцы вязалі сеткі, рабілі ліманад, шылі і набівалі матрацы. Цяпер швейны ўчастак не працуе: няма сыравіны.

Ёсць тут і свая хлебапякарня. На ёй працуюць чацвёра хлопцаў, якія пякуць белы і чорны хлеб для ўсёй калоніі. Гэтыя асуджаныя маюць санкніжкі, пры вызваленні яны атрымліваюць спецыяльнасці цестазнаўцаў і пекараў. Жывуць асобна, работа гэтая прэстыжная, заслужыць яе няпроста — трэба не толькі быць здаровым, але і паводзіць сябе на «выдатна».

Кормяць асуджаных — па ўзгодненым з нарматывамі меню — тры разы на дзень. Сёння, напрыклад, у калоніі на абед — малочны суп, пярловая каша з адвараным мясам, кісель і хлеб. Раз на месяц — Дзень беларускай кухні, гатуюць калдуны, дранікі, салянку... Гатуе ежу звычайны кухар, у яго ў памочніках — кухонны нарад з 16 чалавек. Гэта таксама «эліта»: такія асуджаныя, як і пекары, жывуць асобна.

У політэхнічнай вучэльні, якая знаходзіцца на тэрыторыі калоніі, асуджаныя атрымліваюць спецыяльнасці токара, столяра, столяра дрэваапрацоўчых станкоў і слесара. Калі надыходзіць час вызвалення, кожнаму з іх дапамагаюць уладкавацца на працу. Інспектары правяраюць наяўнасць месца для жылля, рэгістрацыі асуджанага, каб не здарылася, што ён выйдзе на волю абсалютна нікому не патрэбны. Аб уладкаванні на працу могуць паклапаціцца бацькі, якія прынясуць даведку, што іх сына бяруць на працу, напрыклад, грузчыкам. Прыкладна паўгода таму супрацоўнікі калоніі ўвялі яшчэ адну практыку — робяць асуджаным пашпарты. З гэтым бываюць цяжкасці, бо часам хлопец трапляе сюды невядома адкуль — не мае родных, аніякіх дакументаў, ведае толькі сваё імя.

У школе цяпер ідуць урокі, дарэчы, навучанне абавязковае для ўсіх. Настаўніца хіміі Галіна Лысенка кажа, што з гэтымі хлапчукамі працаваць, безумоўна, цяжэй, чым са звычайнымі. А цяжкасць перш за ўсё ў тым, што большасць з іх не ўмеюць вучыцца і працаваць, прыходзіцца тлумачыць самыя простыя рэчы.

На інфармацыйнай дошцы ў школе — партрэты тых, хто адбыў тэрмін у калоніі і насуперак цяжкасцям змог наладзіць жыццё. Вось, напрыклад, адзін з тых, кім ганарацца супрацоўнікі калоніі: галоўны інжынер, працуе ў Магілёве...

Ідзём далей. У клубе — бібліятэка. Загадчыца Алена Куталоўская гаворыць, што кнігі тут карыстаюцца попытам. Чытаюць у асноўным папулярную літаратуру, але, здараецца, асуджаныя і на класіку замахваюцца, і нават самі вершы пішуць.

ГУРОЧКІ... У СПІРЦЕ

Асуджаны за год можа атрымаць не больш за шэсць пасылак, вага кожнай да 30 кілаграмаў. Усе яны скурпулёзна правяраюцца. Нельга перадаваць прадукты, якія хутка псуюцца, гарбату ў пакеціках, цыгарэты ў пачках (можна толькі россыпам, бо ў пачках «добрая» радня і сябры могуць схаваць, напрыклад, гераін), хатнія нарыхтоўкі. Кажуць, гэтая забарона з'явілася пасля таго, як «з волі» перадалі банку марынаваных гуркоў... у спірце.

На тэрыторыі калоніі ёсць магазін, два разы на месяц у ім можна купіць прадукты на вызначаную суму. Наяўных грошай тут няма.

Усё, што хлопцы зарабляюць, пераводзіцца на рахунак. У магазіне — гарбата, кава, печыва, цукеркі, кансервы, мыла, зубная паста. Самы папулярны тавар — цыгарэты. Паляць многія, хоць, па словах Алега Шункевіча, апошнім часам усё больш хлопцаў кідаюць гэтую звычку. Цяпер у кожным з атрадаў — па 5-7 чалавек, якія не паляць.

На вуглу спартыўнага поля — тры паштовыя скрыні: для лістоў ва Упраўленне Дэпартамента выканання пакаранняў, кіраўніцтву калоніі і трэцяя — звычайная, для пісьмаў родным і сябрам. Пішуць шмат. Напярэдадні Новага года трэцяя скрыня паўнюткая, зверху яшчэ і пакет з пасланнямі «на волю» прымацаваны. Усе лісты абавязкова чытае цэнзар. Напрыклад, калі ў лісце паведамляецца аб нячысці, якое здарылася ў сям'і асуджанага, з хлопцам спачатку абавязкова пагаворыць выхавальнік. Дарэчы, выхавальнік часцей за ўсё для асуджанага — першы чалавек, да якога ён пойдзе, каб падзяліцца і радасцю, і горам...

Некаторыя хлопцы — з дынастыі зэкаў, у іх сем'ях сядзелі ўсе родныя: тата, мама, брат, дзядзька... У такіх выпадках асабліва цяжка штосьці змяніць у сваім жыцці, бо пасля вызвалення, калі члены сям'і сустракаюцца, размовы — толькі аб зоне. На зоне — твае адзіныя сябры, толькі тут ты адчуваеш сябе як рыба ў вадзе...

НІВОДНАГА РАДКА...

Гэтага хлопца завуць Руслан, ён адбывае пакаранне за забойства — дзевяць гадоў. З сябрамі забілі старога чалавека «з-за гарэлкі», як гаворыць сам асуджаны. Судзімасць у яго не першая: у 14 гадоў украў веласіпед... Пачаць нармальнае жыццё Руслану будзе нялёгка: яго бацькі жывуць у вёсцы і шмат п'юць. За ўвесь час, пакуль іх сын адбывае тэрмін у калоніі, яны не наведалі яго ні разу. Не даслалі ніводнай пасылкі, вялікую значнасць якіх ведае кожны асуджаны. Ды што там пасылкі — ні ліста, ні радка...

— У мяне яшчэ два браты ёсць. Адзін працуе ў Мінску, мы з ім не кантактуем, другі сам нядаўна выйшаў з турмы, толькі ён мне і піша часам...

— Тут я школу скончыў, выйду — на правы здаваць буду, спадзяюся вадзіцелем куды-небудзь уладкавацца...

У наступным годзе Руслан выходзіць на волю па ўмоўным датэрміновым вызваленні. Такі шанц атрымлівае кожны асуджаны, які адбыў палову ці дзве трэці тэрміну. Ці рэалізуе хлопец гэты шанц — залежыць толькі ад яго. Не ўсім удаецца пратрымацца. Некаторыя вяртаюцца ў калонію вельмі хутка...

Таццяна ФЁДАРАВА.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЯК АДРОЗНІЦЬ САПРАЎДНЫ ФЛІКЕР АД ПАДРОБКІ?

Многім бацькам давядзецца купляць новыя флікеры для сваіх дзяцей. Як высвятлілася, не кожны святлоадбівальны знак з'яўляецца флікерам.

— З першага верасня ўведзена абавязковая сертыфікацыя святлоадбівальных знакаў, — расказвае **начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі маёр міліцыі Жанна ТРАЙНО.** — Зараз улічваецца якасць, бо флікер павінен быць бачны вадзіцелем у цемры на адлегласці каля 140 метраў. У такім разе ён паспее спыніцца, калі ўбачыць на праезнай частцы дарогі пешахода. Літаральна год назад Дзяржаўтаінспекцыя правяла эксперымент, у выніку якога высветлілася, што не ўсе флікеры аднолькава добра бачныя ў цемры. Таму і паўстала пытанне аб абавязковай сертыфікацыі святлоадбівальных элементаў.

— Жанна, а што рабіць са святлоадбівальнымі элементамі,

якія пешаходы набылі раней, да таго, як была праведзена сертыфікацыя?

— ДАІ, вядома, не будзе прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці за выкарыстанне флікераў, якія не прайшлі сертыфікацыю. Але лепш за ўсё не рызыкаваць сваім жыццём і купіць новы святлоадбівальны элемент. Кошт тых жа флікераў складае 1,5-3 тысячы рублёў. Паверце, што жыццё даражэй, чым пару тысяч рублёў! Таму ўсім бацькам раю купіць для сваіх дзяцей новыя флікеры, якія прайшлі абавязковую сертыфікацыю.

ЯК АДРОЗНІЦЬ ФЛІКЕР АД ПАДРОБКІ?

Праблема заключаецца ў тым, што сапраўдны флікер самастойна адрозніць ад падробкі вельмі складана. Некалькі парад, як гэта зрабіць.

1. Трэба купляць святлоадбівальныя элементы бела-шэрага альбо ярка-лімоннага колеру. Святлоадбівальнікі толькі гэтых колераў адпавядаюць патрабаванням стандарту.

2. Нанесеныя малюнкі зніжаюць эфект святлоадбівання, таму, чым меншы малюнак на флікеры, тым лепш. А лепш за ўсё купляць флікеры наогул без малюнкаў.

3. Заўсёды трэба звяртаць увагу на інфармацыю аб вытворцы і імпарцёры прадукцыі, глядзець на год выпуску і тэрмін прыгоднасці.

4. Звяртайце ўвагу на маркіроўку, якая павінна адпавядаць дзяржаўным стандартам.

Асабліва актуальная тэма флікераў цяпер, калі светлавы дзень значна скараціўся. Таму бацькам трэба паклапаціцца, каб у іх дзяцей былі сапраўдныя флікеры.

Дзмітрый БОБРЫК.

НОВІКІ І ІХ ДЗЕЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Паважаная рэдакцыя, — звярталася да «Звязды» і намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Надзея Кухнарэвіч, дзяўчынка, якая згубіла абодвух бацькоў. — *Я не разумею, калі гаворыцца, што мы, дзеці з дзіцячага дома сямейнага тыпу, больш забяспечаныя, чым дзеці з прыёмных сем'яў. Прыёмная сем'я, як і мы, атрымлівае кампенсацыю за святло, паліва, ваду, каналізацыю і вывад смецця. Наконт рамонту: я ў доме жыву тры гады і ні адзін раз нам ніхто не дапамагаў адрамантаваць што-небудзь.*

Зразумела я толькі адно. Што пенсію па страце карміцеляў я не атрымліваю цалкам таму, што ёю кампенсуюць выдаткі на пражыванне ў нашым доме, дзе заўжды чыста, цёпла і светла».

Справа ў тым, што, дзецям-сіротам і дзецям без бацькоўскай апекі, якія знаходзяцца ў прыёмных і апякунскіх сем'ях, пенсіі выплачваюцца ў поўным памеры, а пенсіі па страце карміцеля дзецям, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, выплачваюцца часткова. Напэўна, калі б у рэальнасці ўсе дзіцячыя дамы сямейнага тыпу атрымлівалі абяцаную ў заканадаўстве падтрымку, ні ў Надзеі Кухнарэвіч, ні ў Алены Новік не ўзнікла б жаданне апратэставаць словы: «разам з тым аб'ём матэрыяльнай падтрымкі дзіцячым дамам сямейнага тыпу ў параўнанні з той жа прыёмнай сям'ёй большы».

Алена Аляксандраўна не рашалася паслаць пісьмо, па-першае, таму што не прывыкла скардзіцца. Па-другое, не прывыкла прасіць. А па-трэцяе, мела сумны вопыт перапіскі. Тры гады таму яна пісала ўжо... Дзеду Марозу ў Белавежскую пушчу. Прасіла выканаць запаветнае жаданне: дапамагчы правесці газ у дом, дзе жывуць прыёмныя дзеткі. І атрымала адказ.

«По вашему письму, — пісаў беларускі Дзед Мароз па-руску, — сообщаем, что принято решение о подключении вашего дома к газовому отоплению и само отопление будет производиться на льготных условиях, т.е. бесплатно. Эту информацию дали мне в отделе социальной поддержки населения. С ув. Дед Мороз».

«...У райвыканкаме нам сказалі, што грошай няма, нікому нічога яны не абяцалі, а Дзед Мароз абяцаў, няхай ён газ і падводзіць, — узгадвае гэту невясёлую навагоднюю гісторыю Алена Новік. — Маўляў, трэба было думаць: ці ў стане забяспечыць дзяцей, перш чым столькі браць. Адчыталі як нашкодзіўшых катоў, пасаромілі — год сорамна было зайсці ў райвыканкам. Першую зіму ў новым доме памерзлі: вышэй за 12 градусаў па Цэльсію тэмпература не падымалася, спалі апранутыя. Дровы і брыкет не маглі нагрэць такі вялікі аб'ём дома. Да другой зімы газ падвялі самі...»

«Ніхто іх не прымушаў браць дзяцей»

Узгадаўшы гэту гісторыю, Алена Аляксандраўна зноў падпісалася, паставіла дату і... яшчэ чатыры дні пісьмо не адпраўляла. Апошняй кропляй стала размова з начальнікам упраўлення адукацыі Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта Валерыем Бацько падчас «прамой лініі» ў раённай газеце. Алена Аляксандраўна спытала па тэлефоне, чым мясцовыя ўлады дапамагаюць дзіцячаму дому Новікаў. Адказ быў кароткі: бацькам — зарплата, дзецям — грашовая дапамога і льготы, кампенсацыя выдаткаў за свет і газ на прыёмных дзяцей. А больш — нічым. Гэта іх, Новікаў, дом і яны добраахвотна, ніхто іх не прымушаў браць дзяцей, узвалілі на свае плечы ўсе турботы.

Аднак Алена Аляксандраўна не магла зразумець, чаму двум іншым дзіцячым дамам сямейнага тыпу ў Смаргоні, адкрыццё якіх было запланавана на гэту восень (цяпер перанесена на снежань), дапамога, і значная, усё ж аказваецца (акрамя заробку нанятым бацькам і дапамогі на дзяцей). Там сапраўды, як прапісана ў Палажэнні аб дзіцячым доме сямейнага тыпу, з мясцовага бюджэту аплачваецца мяккі інвентар, мэбля і ўсё неабходнае абсталяванне: ад лямпачак і сталовых прыбораў да пральнай машыны і пыласоса. Валерый Уладзіміравіч патлумачыў, што размова ідзе пра спецыяльныя жылыя памяшканні, якія будаваліся пад дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Гэтыя будынкі не належаць бацькам-выхавальнікам і іх будзе цалкам утрымліваць райвыканкам: рамонт, мэбля, люстры, камунальныя паслугі...

Высветліў начальнік упраўлення адукацыі і сітуацыю з нявыкарыстанымі водпускамі: «Самі вінаватыя, што не хадзілі своечасова».

Алена Аляксандраўна тлумачыць у пісьме, чаму яны «не хадзілі»: *«Нам прапаноўвалі ісці ў адпачынак, пры гэтым дзеці застаюцца ў сям'і, многія так і «адпачывалі». Дык якая розніца: ці заробак ты атрымліваеш, ці адпускныя, калі ўсё роўна дзяцей глядзець трэба. Мы спадзяваліся на кампенсацыю, а яна нам, аказваецца, не належыць...»*

Пасля гэтага Алена Новік, нарэшце, адаслала пісьмо ў Мінск. Пачуццё несправядлівасці перапоўніла яе. А так як галоўным пытаннем было, ці належыць прыёмным бацькам і бацькам-выхавальнікам кампенсацыя за нявыкарыстаныя водпускі, рэдакцыя паслала пісьмо ў міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Адтуль пісьмо было перасланае ў Міністэрства адукацыі, якое адзінае кампетэнтнае па ўсіх пытаннях, звязаных з прыёмнымі сем'ямі і дзіцячымі дамамі сямейнага тыпу. Праз некаторы час «Звязда» і Новікі атрымалі адказ ад Міністэрства адукацыі:

«У адпаведнасці з артыкулам 161 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь частка працоўнага водпуску, якая перавышае 21 каляндарны дзень, па згодзе паміж работнікам і наймальнікам можа быць заменена грашовай кампенсацыяй. Усталяваны мінімальны тэрмін водпуску на працягу 21 каляндарнага дня ў працоўным годзе павінен быць выкарыстаны работнікам для адпачынку ў абавязковым парадку. Такім чынам, грашовую кампенсацыю Вы можаце атрымаць за 35 каляндарных дзён (56-21) нявыкарыстанага водпуску толькі са згоды наймальніка, бо гэта патрабуе дадатковых фінансавых сродкаў.

Замена водпуску грашовай кампенсацыяй з'яўляецца выключэннем, а не правілам, абавязковым да выканання.

У адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай сям'і, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28.10.1999 № 1678 (п. 31) працоўны водпуск прыёмным бацькам даецца згодна з графікам працоўных водпускаў, які складае ўпраўленне (аддзел) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, які заключыў з імі працоўны дагавор. На час працоўнага водпуску органы апекі і папячыцельства арганізуюць летні адпачынак прыёмных дзяцей».

Цяпер Алена Аляксандраўна знаходзіцца ў першым сваім з 2002 года водпуску, адразу за 2 гады — 112 дзён — з верасня па люты. Пры гэтым яна кожную раніцу падымае ў школу 6 дзяцей, яшчэ чацвярых збірае ў садок, штодня гатуе сняданак, абед і вячэру на 13 чалавек, за імі ж мые посуд і мые бялізну... Закон, ягоная літара, захаваныя. Але як надоўга гэтай жанчыны, у якой на руках сёння 11 няпоўнагадовых дзяцей, хопіць?



— Так, летам школьнікі знаходзяцца ў лагеры альбо на аздараўленні за мяжой, — не пагаджаецца з міністэрскім адказам суседка Новікаў маці-выхавальніца дзіцячага дома сямейнага тыпу Вольга Рэшкевіч. — Аднак, часцей за ўсё — не адначасова. Да таго ж у многіх прыёмных сем'ях і дзіцячых дамах сямейнага тыпу ёсць дашкольнікі, хваравітыя дзеці, дзеці-інваліды, якіх у лагер не адправіш, у іншую сям'ю на час водпуску не аддасі.

Гэта толькі на паперы выглядае проста. У рэальнасці бацькі-выхавальнікі не маюць магчымасці адпачыць ні пасля свайго працоўнага дня, як астатнія грамадзяне нашай краіны, ні ў выхадныя альбо святочныя дні, ні, даволі часта, раз на год падчас водпуску. Алена Новік тры гады ўжо ездзіць з адным са сваіх прыёмных дзяцей у санаторый. Гэта адзіная яе магчымасць на 21 дзень забыцца на каструлі (пры гэтым яна ўсё роўна з дзіцем). Але ўсе каструлі тады пераходзяць у рукі яе мужа, і ў таго, натуральна, узнікае пытанне, а ці нельга было б нейкага сацыяльнага работніка яму ў дапамогу на гэты час? Ну проста каб трошкі лягчэй было перажыць адсутнасць двух трэціх персаналу дзіцячага дома (з 1,5 стаўкі на сям'ю ягоныя толькі 0,5, таму Мікалай Мікалаевіч працуе яшчэ на двух работах і трымае немалую гаспадарку: пяць парсюкоў, курэй, качак, індыкоў, гусей, коз, да нядаўняга часу — карову). Аднак не, няма такой штатнай адзінкі ў нашых упраўленнях і аддзелах адукацыі — памочнік па гаспадарцы дзіцячага дома сямейнага тыпу. Калі б яна была, бацькі-выхавальнікі мелі б большую магчымасць карыстацца водпускам, і гэта, безумоўна, не толькі працягвала іх уласнае жыццё і здароўе, але і дабратворна адбівалася б на дзецях. Бо такі рэжым, у якім жывуць гэтыя людзі, вышэй за чалавечыя сілы. Таму і вынікі ўсё часцей здараюцца сумныя. І калі сітуацыя не зменіцца, то альбо людзі перастануць браць на сябе такі цяжар, альбо выдаткі дзяржавы і гэтых людзей не дадуць таго, дзеля чаго ўсё гэта задумана і робіцца. У нас проста яшчэ ніхто не падлічваў, колькі падобных сем'яў разбурылася і колькі бацькоў-выхавальнікаў сталі выконваць свае абавязкі фармальна (бо на большае ў іх ужо не хапае сілаў).

Бацька-выхавальнік па аплаце працы прыроўнены да выхавальніка дзіцячага садка. Аднак апошні працуе пазменна, мае рэальныя, а не фармальныя водпускі, выхадныя і «бальнічныя». Не кажучы пра нянечку, музычнага работніка, бухгалтара і каманду повараў. Гэта як мінімум. Так, можна нагадваць гэтым людзям, што яны ведалі, на што ішлі і павінны былі ўзважваць свае сілы. І тады яны будуць маўчаць і не расказваць пра свае праблемы, пра свае «сіндромы выгарання», псіхалагічную стомленасць і дэпрэсію. І можна было б забыцца пра гэтых дзівакоў, калі б не дзве рэчы: грошы падаткаплацельшчыкаў і дзеці.

«Мы звольненыя?»

Нездарма кінарэжысёр Уладзімір Бокун назваў Новікаў унікальнымі людзьмі. Яны працуюць прафесійнымі бацькамі 6 гадоў і я не заўважыла ў іх ніякіх прыкмет «выгарання». Сёлета ў кастрычніку яны ўдачарылі чатырох дзяцей. Акрамя таго ў іх 6 прыёмных і трое родных (двое поўнагадовых). Яшчэ два прыёмныя хлопчыкі з іх сям'і вярнуліся да біялагічных бацькоў. З усімі дзецьмі Мікалай і Алена ласкавыя і ўважлівыя, двое самых малодшых спяць разам з імі ў адным пакоі. Паміж сабой маці і бацька вясёлыя і закаханыя. Але прыкметы фізічнай стомленасці былі: на прыложкавым століку Алены ляжаў прыбор па вымярэнні крывянога ціску, а на ім зафіксаваныя пагражальна вялікія лічбы, якія адлюстраваліся пасля яе візіту ў райвыканкам.

Гэта было 21 лістапада, калі Алена Мікалаеўна зайшла ў выканкам спытаць, ці могуць яны разлічваць на тую ж падтрымку, што і новыя дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, якія рыхтуюцца да адкрыцця? Юрыст ёй патлумачыла, што іх дом не мае таго статусу, што новыя дамы. Алена Аляксандраўна аднесла гэтыя словы да сваёй сям'і (а размова ішла пра будынак, патлумачылі мне потым у выканкаме. — **В.М.**) і ў слязах пайшла.

Адносіны прыёмных бацькоў і бацькоў-выхавальнікаў з органамі ўлады ўвогуле асобная тэма. Добрыя прафесійныя бацькі — проста выратаванне для адміністрацыі (не кажучы пра дзяцей), перад якой стаіць задача скарачаць колькасць дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і любой цаной уладкоўваць іх у сем'і. Гэта і эканамічна выгадна. Настолькі выгадна, што тыя з нанятых бацькоў, хто ходзіць і нешта просіць (а просяць часцей за ўсё не больш за тое, што належыць) пачынаюць раздражняць.

— Новікі — выдатныя прыёмныя бацькі, — кажа Галіна МАЧЭНЯ, галоўны спецыяліст аддзела выхаваўчай работы і аховы дзяцінства ўпраўлення адукацыі Смаргонскага райвыканкама. — Яны — наша апора і надзея. Мы працуем з імі больш за 10 гадоў, з таго часу, як у 1997 годзе аб'явілі акцыю «ДОМ» (Дом Общественного Милосердия). Тады мы вырашылі прапанаваць смаргонцам разабраць выхаванцаў школы-інтэрната на канікулы. У першы год адгукнуліся 48 сем'яў, сярод якіх былі Новікі. Праз некаторы час на канікулы сталі разбіраць 100 працэнтаў выхаванцаў школы-інтэрната. Па выніках акцыі «ДОМ» каля 50 дзяцей знайшлі сабе сям'ю. У Новікаў сапраўды добра атрымліваецца. Яны літаральна выхадзілі маленькага Жэню, які пакутаваў ад наступстваў дзіцячага цэрабральнага паралічу: дрэнна рухаўся, не размаўляў... Яны яго зляпілі, сабралі па кавалачках. І вось як хлопчыку ісці ў школу, біялагічныя бацькі распачалі працэс вяртання Жэні. Калі Алена Новік на судзе зачытвала спіс, куды і колькі разоў яны ездзілі з гэтым малым, каб вярнуць яму здароўе, слухаць яе без слёз было немагчыма. Дарэчы, першы суд яна выйграла. А падчас другога сама ўжо не стала аспрэчваць права біялагічных бацькоў на сына... Пасля гэтага яны выказалі жаданне ўсыновіць некалькіх дзяцей.

— Мне шкада, — дадае Галіна Уладзіміраўна, — што Новікі пакрыўдзіліся і паспяшаліся скардзіцца ў газету. Думаю, мы ўсе пытанні, якія іх хвалююць, вырашылі б і без гэтага.

Аднак пісьмо дзяўчынкі Надзеі Кухнарэвіч у «Звязду» сведчыць, што пытанні ўзнікаюць не ў адных толькі Новікаў. І не ў адным толькі Смаргонскім раёне. А тое, што амаль два гады мясцовыя ўлады не ведалі на гэтыя пытанні адказаў, дае падставы сумнявацца, што нехта іх добрасумленна шукаў. Ды і ці на ўсе пытанні знойдзены адказы? Так, пасля візіту ў райвыканкам журналіста «Звязды» Новікам паабяцалі аказаць неабходную і пасільную дапамогу ў матэрыяльным забеспячэнні іх дзіцячага дома. Ёсць нават надзея, што іх і Рэшкевічаў узгадаюць пры ўрачыстым адкрыцці двух новых дзіцячых дамоў сямейнага тыпу ў Смаргоні, у якім, магчыма, возьме ўдзел не толькі мэр вобласці, але і міністр адукацыі. Людзям жа шмат не трэба, дзеля справядлівасці дастаткова будзе проста ўзгадаць тых, хто быў першым — надзею і апору. Але па-ранейшаму застаецца праблема з рэальнымі водпускамі прыёмных бацькоў, і для яе вырашэння патрабуецца ўжо сур'ёзная работа на дзяржаўным узроўні.

Мне больш за ўсё шкада, што на Новікаў «пакрыўдзіліся» мясцовыя ўлады. Гэта адчувалася падчас апошняй тэлефоннай размовы. Але самае крыўднае ў тым, што калі Новікі чакалі мяне ў машыне з выканкама, Алена Аляксандраўна сутаргава шукала ў сумачцы карвалол, і першае пытанне, якое яна выдыхнула, калі я села ў машыну, было: «Мы звольненыя?» Гэта тыя самыя Новікі, якія без усякай медыцынскай і педагагічнай адукацыі, толькі пры дапамозе любові, увагі і пяшчоты выцягнулі з цяжкога дыягназу не аднаго толькі Жэньку...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Смаргонскі ра-ён.

Зямельнае пытанне

Садаводы сёлета могуць рэгістраваць свае зямельныя ўчасткі ў штатным рэжыме

Згодна з Указам Прэзідэнта Беларусі ад 28 студзеня 2008 года № 50, сёлета ў тэрмін да 8 кастрычніка ўсе члены садаводчых таварыстваў павінны былі зарэгістраваць свае зямельныя ўчасткі. Аднак больш як палова садаводаў у вызначаны тэрмін так і не афармілі свае правы на зямельныя ўчасткі. Днямі ў рэдакцыю пачалі звяртацца карыстальнікі такіх незарэгістраваных зямельных участкаў з пытаннем аб далейшым лёсе гэтай зямлі.

Нагадаю, што ў свой час арганізацыям і грамадзянам для вядзення калектыўнага садаводства было прадастаўлена амаль 522 тысячы зямельных участкаў. Вялікая колькасць зямельных участкаў была зарэгістравана членамі садаводчых таварыстваў, але многія (датычыцца «гаспадароў» каля 270 тысяч такіх участкаў) так і не звярталіся па дзяржаўную рэгістрацыю. Спецыялісты Дзяржаўнага камітэта па маёмасці паведамілі рэдакцыі, што і зараз тэрытарыяльныя арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю прымаюць адпаведныя заявы ад садаводаў аб рэгістрацыі зямельных участкаў. Прыём заяў і рэгістрацыя гэтых участкаў будзе ажыццяўляцца арганізацыямі да новага года ў штатным рэжыме. Суразмоўца ўдакладніў, што цяпер Дзяржкамітэт па маёмасці і Мінэканомікі рыхтуюць сумесныя прапановы па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў ва ўказ № 50, дзе будуць прапісаны і пытанні далейшага лёсу ў новым годзе незарэгістраваных зямельных участкаў, што былі прадастаўлены для ажыццяўлення калектыўнага садаводства.

Сяргей КУРКАЧ.

Наблюдательный совет ОАО «Молодечнолес»

сообщает, что 15.12.2008 года в 11.00 по адресу: г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106, СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Молодечнолес».

Повестка дня:

1. Об утверждении передаточного акта.
2. О внесении и утверждении изменений и дополнений в устав ОАО «Молодечнолес».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106, с 9 по 13 декабря (с 9.00 до 16.30) либо 15 декабря с 9.30 до 10.00.

Начало работы собрания — 15 декабря 2008 года в 11.00.

Регистрация участников с 9.00 до 10.30 по предъявлению документа, подтверждающего личность, а представителю акционера и доверенность.

Тел. для справок 8 (01771) 35232. УНП 600066488

В ДОПОЛНЕНИЕ К ИЗВЕЩЕНИЮ,

опубликованному 22.11.2008 г. в номере 221 о проведении открытого аукциона, организуемого ЧУП «Белкооппроект» Белкоопсоюза (организатор аукциона) и Брестским районным потребительским обществом (Продавец) по продаже недвижимого имущественного комплекса — зданий и сооружений, в состав которого входят свинарник с двумя пристройками, скотоубойный цех с сараем (весовой), расположенного по адресу: Брестский район, д. Тельмы-2, **читать:**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.12.2008 г. включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1211.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 3 дней с даты проведения аукциона.

Здание скотоубойного цеха площадью 222,2 кв. м находится в аренде. Срок аренды до 1 августа 2009 г.

Контактные телефоны: 8 017 226 78 84, 226 94 83.

ОАО «Минский подшипниковый завод»

извещает своих акционеров о проведении

16 декабря 2008 года

внеочередного общего собрания акционеров.

Повестка дня:

1. Об объявлении открытого международного конкурса с целью привлечения инвестора для реализации инвестиционного проекта «Техническое перевооружение ОАО «Минский подшипниковый завод».
2. Об утверждении конкурсной комиссии по проведению открытого международного конкурса по выбору стратегического партнера для реализации инвестиционного проекта «Техническое перевооружение ОАО «Минский подшипниковый завод».
3. Об утверждении положения о проведении открытого международного конкурса по выбору стратегического партнера для реализации инвестиционного проекта «Техническое перевооружение ОАО «Минский подшипниковый завод».

Собрание состоится по месту нахождения общества: г. Минск, ул. Жилуновича, 2, актовый зал ЛБК, начало собрания в 15.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни (понедельник—пятница) по указанному выше адресу в кабинете платных услуг на центральной проходной ОАО «МПЗ» в период с 8 по 15 декабря 2008 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв с 11.50 до 12.25), а в день собрания — по месту проведения собрания.

Регистрация участников — 16 декабря 2008 года с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания по предъявлении документа, удостоверяющего личность, для представителей акционеров — документа и доверенности, оформленной в соответствии с нормами законодательства Республики Беларусь.

Справки по тел.: 246 70 31, 246 70 66.

Наблюдательный совет ОАО «МПЗ». УНП 100103346

Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»!

Настоящим извещаем о проведении внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Технобанк» в очной форме

Дата проведения: 12 декабря 2008 года.

Место проведения (адрес): г. Минск, ул. Кропоткина, д. 44, 11-й этаж, комната 1101.

Регистрация участников общества для участия в собрании: с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

Время проведения заседания: с 11.00 до 14.00.

Повестка дня внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Технобанк»:

1. Об утверждении результатов открытой подписки на акции пятого выпуска ОАО «Технобанк».
2. О внесении изменений в устав ОАО «Технобанк».
3. Об утверждении локального нормативного акта ОАО «Технобанк».
4. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
5. О выкупе ОАО «Технобанк» акций собственного выпуска по требованию акционеров ОАО «Технобанк».

Для регистрации с собой необходимо иметь: паспорт (для физических лиц), удостоверение руководителя и печать (для юридических лиц) либо иной документ, подтверждающий полномочия!!!

Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:
г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80.

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«15» декабря 2008 года в 11.15 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный открытый аукцион

по продаже здания, находящегося в собственности города Жодино, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания.

На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:

Здание специализированное для образования и воспитания (дошкольное учреждение № 3) (инв. № 612/С-5631) и сарай, расположенные по адресу: Минская область, г. Жодино, ул. Куприянова, 7 «а».

Земельный участок площадью 0,3458 га, для обслуживания здания, сроком на 25 лет.

Начальная цена предмета аукциона 114 612 578 рублей (в т.ч. недвижимое имущество: 113 835 918 рублей, право заключения договора аренды земельного участка 776 660 рублей).

Сумма задатка предмета аукциона 10 000 000 руб.

Продавец недвижимого имущества – Государственное учреждение «Жодинский территориальный центр социального обслуживания населения».

Арендодатель земельного участка – Жодинский горисполком.

1. Жодинский горисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

2. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

3. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 30 декабря 2008 г.

Порядок проведения аукциона определен постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона. **Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23 октября 2008 г. № 201.** Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686. Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявлений 12 декабря 2008 г. до 13.00.**

www.minsk-region.gov.by

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 5 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь», печ-СВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 студзеня 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 студзеня 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 сакавіка 2009 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў, печы-СВЧ і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 4 лістапада 2008 года. Удачы ў гульні!

Тэрмін правядзення гульні — з 04.11.08 па 14.01.09.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1223 ад 30.10.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на I кв. або 1-е паўг. 2009 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) | Колькасць камплектаў

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месяц | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: (індэкс выдання)

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

«ЗВЯЗДА» ТРЫМАЕЦЦА НА ЛЮБОВІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— «Звязду» выпісваем гадоў з 30 ужо, — прызнаўся ўладальнік нашага «Атланта». — А картачкі на розыгрыш пасылалі рэдка. Няма такой прывычкі ў нас нейкіх падарункаў чакаць. Самі ўсё... А тут...

З найлепшымі пажаданнямі ў адрас «Звязды» — педагог Валожынскай школы-інтэрната для дзяцей-сірот Данута РУСОВІЧ.

Тут у размову ўступіла больш гаваркая палавіна Браніслава Іванавіча:

— Я ж ніколі, — прызналася Ганна Рыгораўна, — не ўзіралася ў той спісак прызёраў. Хіба вокам адным — ці ёсць хто з раёна. І тут гляджу — нікога, ні гадзіннікаў нам, ні кепачак. А ўнізе прозвішча знаёмае — Барбашынскі. Гандбаліст такі, ведаю, ёсць. Але ж тут, бачу, імя зусім не яго, а... майго, Браніслава Іванавіча... Ведаеце, нам гэты прыз, як сам Бог паслаў. У нас дома «Снайге» яшчэ. Некалі ў маладосці куплялі. Цяпер, як стану размарожваць, столькі вады нацячэ. Так і стой з анучай, так і глядзі... Ведама, столькі гадоў! І на новы пакуль мяняць не збіраліся — трэба хату трохі падладзіць. Вокны во памянялі, рамонт развялі. Дзеці не спарадкаваныя.

Крый Бог падумаць, што з дзецьмі ў сям'і Барбашынскіх нешта не так! Яны — фотакартак, на жаль, не бачылі — але ж, мяркуючы па бацьках, павінны быць і прыгожыя, і разумныя, і працавітыя. «Не спарадкаваныя», значыць, не жанатыя-незамужнія. Сын — выкладае музыку ў Навапольскай школе, дачка таксама непадалёк — працуе настаўніцай нямецкай у Багданаўскай...

«Чароўны» гадзіннік у руках намесніка старшыні Вілейскага райвыканкама Мікалая КАРОТКАГА.

У маці таксама дзве мовы па жыцці — беларуская і нямецкая. На першай, як прызналася, гаварыла заўсёды і ўсюды, дзе толькі была — у Сібіры, ў Ленінградзе, у Эстоніі... І яе разумелі: нідзе і ніколі не адчула пагарды. Хутчэй, наадварот — цікавасць, сімпатыю, павагу да ўсіх землякоў...

— У нашай мове вельмі многа заходніх слоў, — прыводзячы паралелі з нямецкай, гаварыла Ганна Рыгораўна. — Гэта сведчыць аб яе старажытнасці, аб яе еўрапейскасці. Таму яна будзе жыць!.. Я асабіста толькі каб вадзілася з кім, мусіць, перайшла б на іншую, а так — не, нізавошта!

З-за мовы найперш сімпатыя да «Звязды», за-за шчырасці, з-за духоўнасці.



Падпіску на «Звязду» падчас сустрэчы ў Валожыне афармляла паштальён Аліна ЯВІЛІНА (на пярэднім плане).

— Мне здаецца, — працягвала жанчына, — што я асабіста знаёмая з усімі вашымі карэспандэнтамі, што ўсе яны мне — ну як сваякі.

Але мелі нашы прызёры і пажаданні газеце: Ганна Рыгораўна была б удзячна за рэпертуар Купалаўскага тэатра, бо хочацца ж сабрацца і паехаць — на тую ж «Паўлінку» — а калі і ці будуць білеты?.. Браніслаў Іванавіч, шчыра шкадуючы, што ў дзяцінстве («які там розум быў»?) многае прапусціў з таго ж Кандрата Крапівы, іншых класікаў, быў бы ўдзячны за байкі — сапраўдныя...

Хоць і тыя бываліцы, што друкуюцца ў газеце, даспадобы таксама, бо ніхто ж не прыдумвае іх — дыктуе жыццё.

— Мы адну дзяўчыну ў Германію замуж выдалі, — расказвала Ганна Рыгораўна. — Сталі перапісвацца, сталі падарункамі абменьвацца. Ад яе атрымаем — ну так прыгожа ўпакавана ўсё!.. Хочацца ж і нам! А паперы спецыяльнай у Валожыне тады не было — нешта іншае выдумваем. Звоніць яна неяк і кажа, што не трэба мудрыць, загарніце ў «Звязду» ці ў «Працоўную Славу»... Я яе маці так і перадала. Пра «...Славу» яна ўсё зразумела, бо гэта наша раёнка, яны выпісваюць яе, а пра «Звязду» — не. Бацька той дзяўчыны давай адусюль, дзе ўбачыць, зоркі выразаць... Яшчэ і расказвае, што яно ж і праўда: замежнікі нашы армейскія шапкі з зоркамі купляюць, нашы пагоны...

Смеху ў зале было!.. І цёплых прыемных слоў:

— Дзякуй вам за «Звязду»! — гаварыла, прынамсі, каляжанка Ганны Рыгораўны, педагог псіхолаг школы-інтэрната для дзяцей-сірот Данута Аляксандраўна Русовіч. — Дзякуй за надзвычай чыстую, жывую, надзейную крыніцу роднай мовы! Бо да чаго дайшло? Мы тут неяк дакторра хавалі. Шмат было добрых слоў. Гаварыла і я. Ад душы. Што думала... І зразумела ж, па-беларуску. Дык вось, потым падыходзіць да мяне вельмі паважаны чалавек (у нас, у раёне... У вобласці ды і ў краіне) і цалуе мне руку. Кажа, што ён вельмі даўно не чуў вось такой сапраўднай жывой мовы... Ці знойдзем мы дзе ў свеце, каб француз дзякаваў некаму за словы па-французску ці англічанін — па-англійску?.. Мы — дзякуем. У тым ліку, сёння, і газеце за тое святло і дабро, якое разам з ёй прыходзіць у нашыя сэрцы, у нашыя хаты.

— «Звязда», — на той жа ноце падтрымаў потым размову і начальнік раённага вузла паштовай сувязі Зігмунд Сільвестравіч Лужынскі, — трымаецца на любові. На Валожыншчыне ў вас (разам з ведамаснай) каля 700 падпісчыкаў. Пасля гэтай сустрэчы, думаю, іх прыбавіцца.

Тут жа, у зале, працаваў паштальён, можна было падпісацца. Але ж, крый Бог, не па прымусу: кожны павінен быць вольны выбіраць — дзе жыць і з кім, на якой мове размаўляць, што чытаць і выпісваць. Мэта нашай паездкі — проста расказаць пра газету (у тым ліку і тым, хто лічыць яе ваеннай), «сабраць» заўвагі і пажаданні, падзякаваць сваім чытачам за адданасць. І нагадаць, што падпісацца можна заўсёды. А цяпер — самы час яшчэ і выслаць купончык на розыгрыш прызоў. А раптам?

Валянціна ДОЎНАР, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

(Заканчэнне будзе.)

Улюбёная ў свой калектыў, сваю працу аператар галоўнай пошты горада Іўе Алена БАРЫНАВА.

Кліенты сталі больш актыўна страхаваць фінансавую рызыку

Аб гэтым журналістам у Нацыянальным прэс-цэнтры паведаміла намеснік генеральнага дырэктара Беларускага рэспубліканскага ўнітарнага страхавога прадпрыемства «Белдзяржстрах» Юлія Арэшчанка.

У якасці самай буйной страхавой арганізацыі краіны Белдзяржстрах сёлета за 10 месяцаў атрымаў страхавых узносаў у памеры больш за 450 мрлд рублёў, што адпавядае 58 працэнтам ад агульнага аб'ёму страхавых узносаў усіх страхавых установаў рэспублікі. Сёлета Белдзяржстрах дапоўніў пералік страхавых прадуктаў, якія прапануюцца кліентам, яшчэ двума — добраахвотным страхаваннем ад захворванняў і траўмаў, а таксама страхаваннем крэдыта-атрымальнікаў ад няшчасных выпадкаў і хваробаў.

Падстава ўпэўненага і стабільнага развіцця Белдзяржстраха — яго высокая капіталізацыя. На кастрычнік уласны капітал кампаніі склаў 97,2 млрд рублёў, а памер страхавых рэзерваў дасягнуў 321,5 млрд рублёў. Сёлета за 10 месяцаў галоўным страхавым прадпрыемствам краіны было зроблена больш за 409 тысяч страхавых выплат на суму 231 млрд рублёў, што адпавядае 61 працэнту ад агульнага аб'ёму выплат на рынку. Сярод буйнейшых страхавых дапамог гэтага года спадарыня Арэшчанка нагадала аб выплаце на працягу аднаго працоўнага дня па страхавым выпадку непагашэння крэдыту на суму больш як 2,5 млрд рублёў, а таксама па факце прычынення экалагічнай шкоды ў выніку аварыі на нафтаправодзе ў памеры 500 млн рублёў.

Сярод новых і перспектыўных страхавых паслуг суразмоўца адзначыла страхаванне жылых памяшканняў, дзе страхавыя ўзносы ажыццяўляюцца не праз страхавых агентаў, а напрамую ўключаюцца ў «жыроўку» аплаты камунальных паслуг. Сёлета па гэтым відзе страхавання Белдзяржстраха заключана ўжо больш як 20 тысяч дагавораў. Пры такім страхаванні кватэр на суму выплат каля 13 мільёнаў рублёў штомесячны страхавы ўзнос складае толькі каля 3 тысяч рублёў.

Сяргей КУРКАЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.11	15.50	7.39
Віцебск —	8.07	15.32	7.25
Магілёў —	8.01	15.40	7.39
Гомель —	7.50	15.44	7.54
Брэст —	8.24	16.06	7.42
Гродна —	8.17	16.14	7.57

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Аляксея, Максіма, Міхаіла, Паўла, Пракопа, Пятра, Уладзіміра, Фёдара, Філімона, Якава.*
К. *Хрысціны, Генрыха.*



Фота БЕЛТА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

5 снежня

1920 год — у Мінску на базе політэхнічнага вучылішча створаны політэхнікум. З 1933 года — Беларускі політэхнічны інстытут, а з 2002-га — Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.

1766 год — былы марскі афіцэр Джэймс Крысці правёў у Лондане свой першы аўкцыён (зараз аўкцыёны Крысці адны з самых папулярных у свеце).

Цытата дня:

«Самая вялікая памылка — спрабаваць быць больш прыемным, чым ты ёсць насамрэч».

Уолтэр Баджат (1826—1877), брытанскі эканаміст.

Веру Васільеўну ПАВЯДАЙЛА *звяздоўцы шчыра віншуюць з адмысловай падзеяй на яе жыццёвым шляху – 30-годдзем працы ў нашай любімай газеце! Гэта сапраўднае шчасце – быць незаменнай і патрэбнай усім, і няхай яно доўжыцца! Для гэтага жадаем здароўя, дзякуем за Вашу нязменную добразычлівасць і ўважлівасць да іншых. І няхай сябры і блізкія заўжды атуляюць Вас цеплынёй і любоўю. Тое ж самае гарантуем і мы.*

Звяздоўцы.

ДАІ РЭКАМЕНДУЕ ЗІМОВЫЯ ШЫНЫ

Кампетэнтна

— Якія змяненні адносна ўдзельнікаў дарожна-транспартнага руху чакаюцца ў бліжэйшы час у заканадаўстве?

Юрый ЛІТВІН, начальнік аддзела дарожна-патрульнай службы УДАІ МУС Беларусі:

— У хуткім часе мы плануем унесці шэраг змяненняў у Правілы дарожнага руху. Ёсць верагоднасць таго, што вадзіцеляў скутараў будзем прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці за адсутнасць шлемаў і святлоадбівальных камізэлек у абавязковым парадку. Для веласіпедыстаў жа і вадзіцеляў гужавых павозак наяўнасць святлоадбівальнай камізэлькі будзе насіць рэкамендацыйны характар.

Што датычыцца зімовых шынаў, то іх наяўнасць, як і раней, носіць рэкамендацыйны характар. Гэта звязана з тым, што «зімовы абутак» для аўтамабіля шмат каштуе, не ў кожнага ёсць месца для яго захоўвання. Але, высвятляючы прычыны ДТЗ у зімовы час, супрацоўнікі ДАІ будуць звяртаць увагу на тое, якія шыны былі на аўтамабілі. Калі яны не адпавядаюць сезону, пакаранне будзе больш суровым. Мэтазгоднасць гэтага яшчэ раз даказваюць ДТЗ, якія адбыліся падчас першага снегападу. Практычна ўсе, акрамя аднаго, удзельнікі ДТЗ, падчас якіх загінула 10 чалавек, былі «абутыя» ў летнюю гуму. Аўтамабіль, які трапіў у аварыю на тэрыторыі Смалявіцкага раёна, таксама быў «у летніх шынах» (у выніку няшчаснага здарэння загінула сям'я з чатырох чалавек). Прычынай усіх гэтых здарэнняў стала тое, што аўтамабіль выносіла на сустрэчную палосу, у кювет. Рэкамендую вадзіцелям не пашкадаваць сродкаў і часу, памяняць гуму, каб гарантаваць бяспеку сабе і сваёй сям'і.

— Гаварылася, што плануюць перайсці ад солі да больш засцерагальных для машын і абутку рэагентаў. Прыходзіш дадому, як і раней, з белымі разводамі на абутку...

Анатоль АДАМЦЭВІЧ, галоўны спецыяліст Дэпартамента «Белаўтадар» Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі:

— Асноўным рэагентам для папярэджання ўтварэння і ліквідацыі галалёду на дарогах нашай краіны гэтай зімой застанецца тэхнічная соль, а дакладней, адходы, якія мы прывозім з Салігорскіх калійных камбінатаў. Гэта самы прымальны варыянт на сёння. Сумесь пяску з соллю — самы танны сродак барацьбы са слізкай дарогай, адна тона солі каштуе не больш як 10 тысяч рублёў. Акрамя таго, гэта сумесь ідэальна падыходзіць для беларускага клімату.

«Эксперыментальныя пасыпкі для дарогі, каб зняць экалагічную нагрузку на горад, таксама выкарыстоўваюцца, але не ў масавым парадку», — дадаў намеснік начальніка аддзела РУП «БелДарНІІ» Васіль Курловіч.

Што датычыцца абутку, то разводы на прамоклым абутку з натуральнай скуры з'яўляюцца не ад солі, а ад якасцяў самой скуры. На абутку ж з сінтэтычных матэрыялаў ніякіх белых разводаў не будзе.

Надзея ДРЫЛА.

Надзвычай прыгожага чалавека, адданую падпісчыцу і прапагандыстку газеты спадарыню ХУДАЛЕЙ з г.п. Свіслач шчыра віншуем з надзвычай прыгожай датай – з 85-годдзем!

Моцнага здароўя Вам, шаноўная Вера Фёдараўна, радасці, бадзёрасці, усяго самага найлепшага ў Вашым жыцці!

ЗВЯЗДОЎЦЫ

Падазроны ў забойстве экстрадзіраваны з Егіпта ў Беларусь

Нацыянальным цэнтральным бюро інтэрпала ў Беларусі завершаны працэс экстрадыцыі з Егіпта беларускага грамадзяніна 1969 года нараджэння, які вышукваўся Рэчыцкім РАУС за ўчыненне злачынства, прадугледжанага ч. 1 арт. 139 (забойства) КК Беларусі. Аб гэтым паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

Падазроны быў затрыманы егіпецкімі праваахоўнікамі ў кастрычніку гэтага года. Фігурант справы абвінавачваецца ва ўчыненні забойства, якое адбылося ў ноч з 31 жніўня на 1 верасня 2005 года ў дварах дома па вуліцы Войкава ў Рэчыцы Гомельскай вобласці. У п'янай спрэчцы ён моцна збіў мясцовага жыхара, што стала прычынай смерці пацярпелага. Паводле заключэння экспертаў, забітаму было нанесена не менш як пяць удараў кулакамі ў твар, два ўдары ў вобласць шыі, а таксама 24 удары кулакамі, нагамі і металічным цвікадзёрам па тулаве.

БЕЛТА.

УЗНАГАРОДЫ З БОКУ ДЗЯРЖАВЫ — ГЭТА ГОНАР І ЎДЗЯЧНАСЦЬ,

Геральдычныя сімвалы

ШТО АКАЗВАЮЦЦА СВАІМ І ЗАМЕЖНЫМ ГРАМАДЗЯНАМ

«Дзяржаўныя ўзнагароды Латвіі» — перасоўная выстаўка, якая пабывала ў Літве, Эстоніі, Даніі, Люксембургу, Бельгіі, Германіі, а сёлета, у рамках 90-годдзя абвяшчэння незалежнасці Латвійскай Рэспублікі, падарожнічала па латвійскіх рэгіёнах. Яна была створана ў 2004 годзе з мэтай даць уяўленне пра гісторыю Латвіі і яе ўзнагароды. Удзел у гэтым бралі Дзяржаўны Нацыянальны музей гісторыі Латвіі, Рыжскі музей гісторыі і судноходства, Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі. На выстаўцы экспануюцца латвійскія дзяржаўныя ўзнагароды (эталонны камплект), гістарычныя ўзнагароды і гістарычныя прадметы з сімволікай дзяржаўных узнагарод. Кожны з экспанатаў расказвае пра якую-небудзь важную для Латвійскай дзяржавы падзею. З 4 снежня пазнаёміцца з імі ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі могуць і мінчане і госці сталіцы.

На працягу стагоддзяў дзяржаўныя дзеячы выказвалі ўдзячнасць лепшым сынам і дочкам свайго народа, прысуджаючы ім высокія дзяржаўныя ўзнагароды. Мэта гэтай традыцыі — акрэсліць арыенцір адзнакі для сучаснікаў і падбадзёрыць кожнага ў імкненні справамі і думкамі пісаць гісторыю сваёй краіны... Аднак трэба сказаць, што атрыманне вышэйшай узнагароды дзяржавы — гэта не толькі

станоўчая ацэнка справы ўсяго жыцця, але і вялікая адказнасць. Адказнасць і стымул быць і ў далейшых справах прыстойным носьбітам атрыманай узнагароды і візітнай карткай сваёй нацыі як сёння, так і праз дзясяткі і сотні гадоў. Гэтыя словы належаць Прэзідэнту Латвійскай Рэспублікі Валдзісу Затлерсу.

...Ваенны ордэн Лачплесіса — першая і найвышэйшая ваенная ўзнагарода ў Латвійскай Рэспубліцы, якая была заснавана падчас баёў за свабоду. 11 лістапада 1918 года пасля месячнага акружэння Рыга была вызвалена і жыхароў разбудзіла ўжо не артылерыйская канада, а царкоўныя званы, якія заклікалі памаліцца за душы тых, хто ахвяраваў жыцці за Айчыну.

І назва ордэна, і графічнае адлюстраванне выбраны не выпадкова. У цэнтры медальёна ўзнагароды — выява барацьбы героя народнага эпаса Лачплесіса з мядзведзем. Гэта як увасабленне тугі латышскага народа па волі і сімвал гераізму, памкнення да нацыянальных волі і незалежнасці. У ваеннага ордэна Лачплесіса было тры разрады, узнагароджанне пачыналі з ніжэйшага — III разраду, пасля гэтага можна было атрымаць II і I разрад (гэта ўмова была неабавязковай пры ўзнагароджванні іншаземцаў). За дзевяць гадоў было ўручана ўсяго 2146 знакаў ордэна ўсіх трох разрадаў. Сярод узнагароджаных былі таксама і тры жанчыны. Самаму малодшаму з кавалераў на момант здзяйснення подзвігу было толькі 14 гадоў. Узнагародзілі ордэнам таксама адзін горад, крэпасць у Францыі, Вердэн — за гераізм падчас Першай сусветнай вайны.

24 сакавіка 1924 года быў заснаваны Ордэн Трох Зорак — вышэйшая грамадзянская ўзнагарода ў дзяржаве за заслугі перад Айчынай. Апошнія маглі быць у дзяржаўнай, кіраўніцкай, грамадскай, культурнай ці гаспадарчай дзейнасці. Ордэнам можна было ўзнагароджваць і асобаў, што знаходзіліся на дзяржаўнай службе, у тым ліку салдатаў, а таксама іншаземцаў. Дэвіз узнагароды — «Праз церні да зорак». Першым яго кавалерам стаў першы Прэзідэнт Латвіі Яніс Чаксдзяржаўных узнагарод — ваеннаму ордэну Лачплесіса і Ордэну Трох Зорак — былі заснаваны яшчэ два ордэны. Гэта былі ордэн Віестурса і Ганаровы крыж.

тэ. Заснаваны ордэн быў у гонар аб нараджэнні Латвійскай дзяржавы ў 1918 годзе, адноўлены пасля вяртання незалежнасці 25 кастрычніка 1994 года.

У 1938 годзе ў дапаўненне да ўжо існуючых дзвюх вышэйшых

Першая ўзнагарода была заснавана ў памяць старажытнай самастойнасці краіны. Віестурс быў палкаводцам і правіцелем у XIII стагоддзі. З пачаткам нямецкага нашэсця ён напачатку супрацоўнічаў з крыжакамі, але потым пачаў актыўна з імі змагацца. Ордэн Віестурса прысуджаецца як знак пашаны за заслугі ў выхаванні, удасканальванні ўзброеных сілаў дзяржавы, умацаванні бяспекі, ахове межаў. Адноўлены ён быў, згодна з законам аб дзяржаўных узнагародах, 25 сакавіка 2004 года.

А за дзень да гэтай даты быў адноўлены Ганаровы крыж, які мае доўгую гісторыю. Ордэн Ганароваго крыжа 13 мая 1710 года заснаваў малады курземскі герцаг Фрыдрых Вільгельм. Ён задумаў яго як знак прызнання для людзей, якім хацеў аддзячыць або якіх імкнуўся зрабіць сваімі паплечнікамі. Колькасць рыцараў (у статуце яны названы таксама ордэнскімі братамі) была абмежавана. У адпаведнасці з еўрапейскімі традыцыямі, герцаг планаваў у замку абуладкаваць рыцарскую залу, дзе б знаходзіліся партрэты і выканаўцаў з медзі гербы ордэнскіх братоў, аднак задумку ажыццявіць не паспеў. На жаль, ніводнага экзэмпляра ўзнагароды тых часоў не захавалася. У 1938 годзе ордэн — з невялікімі змяненнямі — быў адноўлены ў першы раз. Ганаровы крыж прысуджалі «за выключную любоў да Айчыны і за заслугі ў дзяржаўнай, грамадскай і культурнай дзейнасці».

Як сказаў Прэзідэнт Латвійскай Рэспублікі, «З вяртаннем незалежнасці былі адноўлены тры гістарычныя дзяржаўныя ўзнагароды Латвіі — Ордэн Трох Зорак, Ордэн Віестурса і Ганаровы крыж. Сёння гэта як бы сімвалічная і поўная павагі ўдзячнасць дзяржавы не толькі самому кавалеру ордэна, але і яго сям'і. І найперш усяго бацькам, якія выхавалі такога годнага і смелага чалавека».

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аўтар выказвае падзяку намесніку дырэктара Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі Любові Балаўнёвай за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.

ЦУДАДЗЕЙНАЯ СІЛА СВЕЧКІ

Вопыт нашых продкаў неаднаразова даказваў, што свечка, зробленая сваімі рукамі або набытая ў храме, але асвечаная ў час вялікіх святаў, атрымлівала магічныя здольнасці і магчымасці. І сёння даволі шырока распаўсюджаны звычай прыносіць дадому свечкі, з якімі стаялі ў час набажэнства ў дні вялікіх хрысціянскіх святаў: на Хрышчэнне (19 студзеня) — Богаяўленская свечка, на Стрэчанне (15 лютага) — Грамнічная свечка, у Чысты Чацвер — Чацвяговая свечка, на Вялікдзень — Велікодная свечка. Гэтыя свечкі захоўвалі на працягу года ў чырвоным куце і выкарыстоўвалі ў пэўных рытуальных дзеяннях. У народзе верылі, што кожная з іх валодае асаблівымі цудоўнымі якасцямі.

- Так, Богаяўленскую або Хрышчэнскую і Велікодную свечкі запальвалі, каб папярэдзіць узнікненне пажару ў сваёй хаце: у час навальніцы і ўдараў маланкі, калі недалёка быў пажар і г.д.
- Богаяўленскую свечку, як і вянчальную, запальвалі ў час цяжкіх родаў.
- Часам Грамнічную свечку ставілі каля варот, каб ніякі злодзей не здолеў «загаварыць сялянскую гаспадарку».
- Грамнічнай свечкай «замыкалі», г.зн. абыходзілі па сонцы, карову, каб засцерагчы карміцельку ад нячыстай сілы.
- Чацвярговая свечка (асвечаная ў храме ў дзень Вялікага Чацвярга перад Вялікаднем), па меркаваннях нашых продкаў, валодала ачышчальнай функцыяй, здольнасцю адганяць нячыстую сілу. Такую свечку выкарыстоўвалі знахары пры лячэнні захворванняў скуры і ліханкі.
- Пчаляры таксама выкарыстоўвалі Чацвярговую свечку. Лічылася, што на працягу года гэта свечка будзе засцерагаць пчальнік ад сурокаў, а восенню забяспечыць выдатны збор мёду.

Велікодная свецка, як вынік значнасці самога свята, надзялялася звышнатуральнай сілай. Толькі з яе дапамогай можна было паправіць «сурочаную» хату, пазбавіцца ад цяжкіх захворванняў.

- Каб выйсці замуж, дзяўчына імкнулася як мага раней прыйсці ў храм у дзень Пакроваў (14 кастрычніка) і першай паставіць свечку перад іконай Багародзіцы.
- Царкоўную свечку нельга тушыць ротам (у асяродку нашых продкаў існавала строгая забарона пляваць на полымя) — яе неабходна акуратна затушыць рукамі.
- Абгаркі свечак, якія застаюцца дома, нельга выкідаць, як звычайнае смецце. Іх трэба сабраць, а затым аднесці ў храм і пакласці туды, дзе збіраюць недапаленыя свечкі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

